Кампартыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 254 (5097)
ЛІСТАПАДА
26
ПАНЯДЗЕЛАК
1934 г.
год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ПЕРШАЙ МЕНСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ЗОТАЎЦАЎ

Прывітанне ЦК КП(б)Б

Вам, перадавым ударнікам аўладання тэхнікай—лепшым прадстаўнікам прамысловасці горада Менска—ЦК КП(б)Б шле шчырае большэвіцкае прывітанне.

ЦК упэўнен, што ўдарнікі-зотаўцы пад кіраўніцтвам Менскага гаркома КП(б)Б пакажуць далейшыя ўзоры барацьбы за поўнае выкананне прадпрыемствамі г. Менска промфінплана другога года 2-й пяцігодкі, ліквідуюць адставанне менскіх прадпрыемстваў, і што лепшыя ўзоры барацьбы за асваенне тэхнікі заводаў імя **Варашылава** і **«Большэвік»** перакінеце на ўсе прадпрыемствы горада Менска, выведзіце іх у перадавыя шэрэнгі прамысловасці БССР.

Няхай жывуць ударнікі-зотаўцы!

Няхай жыве ЦК ВКП(б)—кіраўнік і арганізатар пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва і яго правадыр тав. Сталін!

Сакратар ЦК КП(б)Б **ВАЛКОВІЧ.**

МАСТАЦКУЮ ЛІТАРАТУРУ—У МАСЫ

Ініцыятыва Аршанчыны аб арганізацыі ўсебеларускага паходу за асваенне калгаснікамі мастацкай літаратуры сустрэла самы жывы водгук у калгасах, на заводах і прадпрыемствах Совецкай Беларусі. З глыбін Палесся — Мазырчыны, Нароўлі, з Крычава і Старых-Дарог, Ушач і Полаччыны паведамляюць аб арганізацыі літаратурных гурткоў, аб масавым чытанні мастацкай літаратуры.

Мы з'яўляемся сведкамі культурнага росту мільёнаў, прагавітай цягі мільёнаў да сапраўднага большэвіцкага рэвалюцыйнага мастацтва. Паход з надзвычайнай яснасцю яшчэ раз паказвае, што ў працах усесаюзнага з'езда совецкіх пісьменнікаў прымала ўдзел уся краіна, самыя шырокія працоўныя масы.

Нідзе і ніколі ні ў якой краіне і ні ў якую эпоху літаратура не карысталася такой увагай мас, як наша, — самая перадавая, самая ідэйная, самая рэвалюцыйная літаратура ў свеце. Гэта тлумачыцца тым, што ў аснове твораў совецкай літаратуры ляжыць барацьба рабочага класа і калгаснага сялянства за соцыялізм, што наша літаратура абазнае роўнапраўе працоўных усіх нацый, адстойвае роўнапраўе жанчын, разбівае ўсякую містыку, забабоны і інш.

У нашай краіне літаратура карыстаецца такой увагай таму, што самыя шырокія масы зразумелі, што літаратура і мастацтва прымаюць актыўны ўдзел у фармаванні свядомасці людзей і тым самым у поўнай меры вызначаюць паводзіны людзей у класавай барацьбе, у соцыялістычным будаўніцтве. Іменна гэта ўсведамленне, выхоўваючае і фарміруючае свядомасць людзей, меў на ўвазе таварыш **Сталін**, называўшы пісьменнікаў «інжынерамі чалавечых душ».

Наша літаратура стала цэнтрам, якаючым мысліі пачуцці лепшых людзей усяго чалавецтва, лепшых мастакоў эпохі, найбольш мужных, сумленных, глыбокіх людзей.

Лепшыя творы совецкай літаратуры—«Маці» **М. Горкага**, «Падняятая цаліна» **М. Шолахава**, «Капітальны ремонт» **Собалева**, «Спалох на загонах» П. Галавача і іншыя ўзнімаюць людзей, натхняюць іх і надаюць ім бадзёрасць для далейшай барацьбы за соцыялізм. Іменна таму працоўныя Аршанчыны — ініцыятары паходу прапанавалі ўключыць гэтыя кнігі ў літаратурны мінімум.

Кожны работы, кожны калгаснік, кожны чырвонаармец павінен чытаць мастацкую літаратуру, кожны працоўны павінен чытаць і ведаць сваіх пісьменнікаў, лепшыя творы совецкай літаратуры, бо яны ўзбройваюць масы на барацьбу за соцыялізм. Кожны з іх павінен ведаць, што побач з танкамі, аэраплянамі і гарматамі на абароне нашай соцыялістычнай радзімы стаіць наша совецкая літаратура, якая адыгрывае немалую ролю ў справе ўзбраення шырокіх мас.

У калгасе «Рухавік рэвалюцыі», Мазырскага раёна, 35 маладых калгаснікаў заканчваюць у гуртку чытанне і абгаварэнне кнігі М. Шолахава «Паднятая цаліна». Гэту кнігу ў тым самым раёне чытаюць 20 чалавек у калгасе «Новы шлях»; усе комсамольцы і 10 чалавек беспартыйнай моладзі ў калгасе «Новыя Дудзічы». Палітаддзел Дамжанавіцкай МТС 25 снежня склікае па сваёй зоне злёт чытачоў кнігі «Паднятая цаліна».

З захапленнем чытаюць кнігу «Дрыгва» Якуба Коласа ў калгасах Крычаўскага раёна, «Маці» М. Горкага ў калгасах Аршанчыны і Менскага раёна. У гуртках чытаюць «Железный поток» Серафімовіча, «Над рэкой Адэсай» Я. Купалы», «Спалох на загонах» П. Галавача, «Цені на сонцы» А. Александровіча.

Гэты масавы рух за асваенне літаратуры трэба падхапіць і арганізаваць. Гэта абавязак партыйных, совецкіх і комсамольскіх арганізацый, якія ў першую чаргу павінны гэту справу ўзначаліць.

ЦК КП(б)Б, ухваліўшы аршанскую ініцыятыву, прапанаваў усім райкомам і палітаддзелам бездакладна стварыць раённыя штабы і прыступіць да арганізацыі гурткоў. Гэта прапанова ЦК, апублікаваная 6 лістапада ў «Звязде», дагэтуль яшчэ ў большасці раёнаў БССР не выкапана. Толькі ў Аршанскім, Менскім, Мазырскім, Старадарожскім, Ушацкім і Барысаўскім раёнах канкротна прыступілі да работы.

На працягу бліжэйшых двух тыдняў у кожным раёне павінна быць створана не менш 20-25 гурткоў, забяспечаных кваліфікаванымі кіраўнікамі з лепшых настаўнікаў і культурных сіл вёскі. Не трэба гнацца за колькасцю паведальнікаў гурткоў. Але трэба абавязкова забяспечыць, каб у кожным гуртку было мінімум 10-12 чалавек пастаянных слухачоў, якія з'явяцца асноўным каспяком гуртка.

У справе разгортвання паходу, вялікую ролю адыгрывае раённы і палітаддзельскі друк. Толькі нязначная колькасць газет перадрукавалі аршанскую адозву і паведамленні цэнтральнага штаба. У цэлым радзе раёнаў аб арганізацыі паходу нават і не ведаюць. Гэта памылка нашага друку павінна быць бездакладна выпраўлена. Гэта ў аснавальнай меры датычыць і цэнтральных газет («Рабочий», «Чырвоная змена», «Орка» і інш.). Паход за асваенне мастацкай літаратуры — не ведамственная справа, гэта справа ўсёй шырокай, партыйнай і совецкай грамадскасці і на яе ажыццяўленне трэба мабілізаваць максімум сіл.

Трэба адзначыць чулы падыход рабочых друкарні імя Сталіна (Менск) і Палесдрук (Гомель), якія звыш плана тэрміновым парадкам выконваюць заказ Белгазвыдавецтва па выдачы кнігак па літаратурнаму мінімуму. Гэта таксама адзначыць, што кнытычнае аб'яднанне саюза пісьменнікаў БССР тэрміновым парадкам выстуе да друку метадычны дапаможнік для кіраўнікоў гурткоў.

Такое-ж усведамленне важнасці паходу мы патрабуем ад усіх партыйных арганізацый і палітаддзелаў, ад усяго раённага і цэнтральнага друку.

Напярэдадні ўсебеларускага злёта „ЗОТ"
цяжкай прамысловасці

ЗЛЁТ ЗОТАЎЦАЎ СТАЛІЦЫ

23 лістапада ў Доме партактыва адбыўся злёт зотаўцаў прадпрыемстваў цяжкай прамысловасці Менска. З дакладам аб далейшых задачах зотаўцаў выступіў тав. **Варончанка.**

Выступаўшыя ў спрэчках рабочыя-зотаўцы расказвалі аб вопыце барацьбы па аўладанню тэхнікай. Былі падвергнуты рэзкай крытыцы недахопы ў пастаноўцы тэхнічнага навучання рабочых на асобных заводах.

Жорсткай крытыцы была падвергнута работа менскага Дома тэхнікі. Гаварылі зотаўцы аб тым, што Дом тэхнікі не дапамагае ім у арганізацыі тэхгабінетаў, што ён не стаў цэнтрам збору вопыту зотаўскага руху.

З вялікай прамовай выступіў загадчык Промаддзела ЦК КП(б)Б тав. **Готфрыд.** Ён уніёс прапанову ўстанавіць дзве ступені тэхвучобы і за больш павышаны курс аўладання тэхнікай, за лепшую работу пасля здачы тэхэкзамена выдаваць значок «ЗОТ» 2-й ступені.

— Многа прадпрыемстваў Менска,—гаварыў ён,—у вялікай запазычанасці дзяржаве. Яна перавышае 7 млн. руб. Зотаўцы павінны быць у перадавых радах барацьбы за промфінплан.

Злёт зотаўцаў, які сабраўся напярэдадні ўсебеларускага злёта «ЗОТ», даў слова партыі прыняць усе захады для поўнага выканання гадавой праграмы. Гэта слова знатныя людзі фабрык і заводаў павінны стрымаць. У нас ёсць усе ўмовы для поўнага выканання гадавой праграмы кожным прадпрыемствам. Трэба толькі з большэвіцкай настойлівасцю змагацца за аўладанне тэхнікай.

Злёт атрымаў прывітальную тэлеграму ад сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Валковіча.**

29 ЛІСТАПАДА Ў 9 ГАДЗІН ВЕЧАРА ЦК КП(б)Б ПРАВОДЗІЦЬ **УСЕБЕЛАРУСКУЮ РАЁНЕРАКЛІЧКУ** ПА ПЫТАННЯХ ПАДРЫХТОЎКІ ЖЫВЁЛЫ ДА ЗІМОВКІ, УЛІКУ ПЛЕМЯННОЙ ЖЫВЁЛЫ, ЗАСЫПКІ НАСЕННЯ І РАЗМЕРКАВАННЯ ДАХОДАЎ У КАЛГАСАХ.

НА ПЕРАКЛІЧКУ ВЫКЛІКАЮЦЦА САКРАТАРЫ РК КП(б)Б, СТАРШЫНІ РВК, ДЫРЭКТАРЫ І НАЧ. ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ МТС, ЗАГ. РАЙЗА І РЭДАКТАРЫ РАЙГАЗЕТ.

ЦК КП(б)Б.

ПАЧАЛІСЯ ВЫБАРЫ У ГАРАДСКІЯ СОВЕТЫ

ЛЕПШЫХ ЛЮДЗЕЙ ПАСЫЛАЮЦЬ У СОВЕТЫ РАБОЧЫЯ МЕНСКА І ВІЦЕБСКА



Студэнты Палітэхнічнага інстытута на справаздачным сходзе. У авале прафесары Палежаеў і Краўцоў у цэзідыуме сходу.

КОМУНАРАЎЦЫ ВЫБРАЛІ СВАІХ ДЭПУТАТАЎ

Тав. ОРДЖАНІКІДЗЕ—ГАНАРОВЫ ЧЛЕН МЕНГОРСОВЕТА, Т. ГІКАЛО ВЫБРАН ЧЛЕНАМ ГОРСОВЕТА

7 легкавых аўтамашын, упрыгожаных лозунгамі, плакатамі, партрэтамі правадыроў, падкацілі да пад'езду кіно-тэатра «Чырвоная зорка». Гэта знатныя людзі завода «Комунар»—героі першай пяцігодкі, лепшыя ўдарнікі барацьбы за промфінплан тт. **Сапчак, Дрэйцэр, Збешынскі, Голуб, Левін, Лібман, Вайтовіч, Копач, Лапін, Міліцкі, Акуценка і інш. прыехалі на выбарчы сход.**

Пад гукі аркестра стройнай арганізаванай калонай рушыў увесь рабочы калектыў «Комунара» на выбары. Ля будынка горсовета комунараўцаў вітаў старшыня гарадскога совета тав. **ЖУКОВІЧ.**

У прэзідыум сходу акрамя упаўнаважанага гарадской выбарчай камісіі тав. **ХАДАСЕВІЧА** выбраны тт. **ДРАБУШЭЎСКІ** і **УМАНСКІ.** Бурнымі воплескамі сустракае зала прапанову выбраць у ганаровы прэзідыум тав. **СТАЛІНА** і тав. **ГІКАЛО.**

Выразна, гучна адчаканьваючы кожнае слова, чытае рабочы-токар тав. **Ноім** наказ. Выбарчыкі з вялікай увагай слухаюць кожны раздзел, кожны пункт. Многія робяць адзнакі ў блок-нотах.

Наказ добры, але ў комунараўцаў многа дадаткаў:

— пабудаваць трамвайны шлях да завода «Комунар»;

— звязаць цэхі завода вузка-каляйкай;

— зрабіць насып ля завода для барацьбы з паводкай;

— пабудаваць цырк;

— усталяваць тэлефоны-аўтаматы ў рабочых пасёлках;

— адкрыць пры заводзе «Комунар» начны санаторый па прыкладу завода «Большэвік»;

— адкрыць магазін па продажу будматэрыялаў;

— заасфальтаваць пляц Волі і пабудаваць там помнік у памяць вызвалення Беларусі ад белапалякаў.

Актыўна абгаварваюць рабочыя кожную кандыдатуру, намечаную ў дэпутаты горсовета. Персанальным галасаваннем выбраны ў горсовет т. т.:

ХАДАСЕВІЧ—намеснік сакратара гаркома КП(б)Б;

ДРАБУШЭЎСКІ, дырэктар завода «Комунар»;

КАПЯЛЕВІЧ СОНЯ, маладая работніца-ўдарніца, актыўная грамадская прапаўніца, комсамолка;

АКУЦЕНКА ЛЮБА—лепшая ўдарніца, брыгадзір свідравальнай брыгады, былы старшыня дэпутацкай групы;

ГУРАЛІС—сакратар парткома завода;

УМАНСКІ—стары рабочы-ўдарнік з 30-гадовым вытворчым стажам, удзельнік грамадзянскай вайны;

НАРАНОВІЧ—лепшы ўдарнік-малатабоец, дэмабілізаваны чырвонаармеец.

Доўга незмаўкаемымі воплескамі сустракаецца прапанова аб выбранні ў члены горсовета сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО.

Ганаровым членам Менгорсовета пад бурныя апладысменты ўсёй залы выбран нарком цяжкай прамысловасці тав. ОРДЖАНІКІДЗЕ.

Кандыдатамі ў члены горсовета выбіраюцца тт. **ГАЙДУК**—рабочы-токар і **МЕСЕЛЬ**—майстар такарнага цэха.

У заключэнне маленькая піонерка перадае прывітанне выбарчыкам і чытае свой наказ дэпутатам горсовета ад імя піонераў.

— Адкрыць піонерскі клуб; пабудаваць лагерны гарадок; пабольшам канькоў і лыж; апрануць школьнікаў у адзіную форму.

400 ПРАПАНСУ УНЕСЛІ МЯСНІКОЎЦЫ

У зале клуба яшчэ задоўга да пачатку справаздачнага сходу ўсе месцы былі заняты.

Старшыня заўкома завода імя Мяснікова Дзямідовіч паведамляе, што на сход з'явіліся ўсе 758 чалавек—100 проц.

Слова для справаздачнага даклада аб рабоце горсовета прадастаўляецца тав. Валодзька.

Німат аб чым гаварыў дакладчык. Больш аб дасягненнях. Мімаходам аб недахопах. Зусім выпусціў работу Менскага вузла.

Пачаліся спрэчкі...

Слова атрымлівае дэпутат горсовета стары чыгуначнік Іваноў.

Іваноў гаворыць аб Вяземскай вуліцы, аб глыбокіх канавах і гнілых мосціках. Стаяць слупы, лампачкі ёсць, а свету няма—гэта называецца асвятленне акраін.

З кожным выступленнем усё больш і больш павялічваецца актыўнасць удзельнікаў сходу.

Стары каваль Кімовіч спяшаецца на работу на трэцюю змену.

— Я вельмі хачу выступіць, хоць-бы два словы сказаць,—просіць ён прэзідыум. Яго просьба здавальняецца.

Выступаюць рабочыя **Іваноўіч, Шабалінскі, Дунаёўскі, Хасін, Латагурскі**, майстар **Сіротка**, машыніст **Рымашэўскі**, прыбральшчыца **Цыбульская.**

Яны гаварылі аб бяздзейнічаючым валаправодзе на Грушаўскім пасёлку, аб незабружаваных вуліцах, аб ралый і вучнёўскіх абедах, аб базарах і прыгарадным чыгуначным руху, аб школьных падручніках і ніжаякасным абутку.

Ужо 12 гадзін ночы, а спіс яшчэ далёка не вычарпан. Многім з-за позняга часу не далі слова. 400 прапаноў унеслі мяснікоўцы ў новы наказ горсовета.

З вялікай прамовай на сходзе выступіў загадчык прамыслова-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б тав. **ГОТФРЫД.**

І. Т.

АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

НОВЫ МЕНСК

1.

Красуй, сталіца маладая,
Твой бурны дзень, твой горды рух,
Твой стан, як слава, вырастае
Гадам свінцовых завірух.

Як слава тым, хто стаў дахвярай:
Хто залатому гругаву —
Пад чорным сцягам смертнай кары
Не прадалі тваю вясну.

Яна расцветам сіл іскрыцца,
Граніц не ведае расцвет.
Вясну тваю—пяю, сталіца,
Я—сын табе, я—твой паэт.

2

Бываць парой люблю ў архівах,
З падзей далёкіх скіну пыл.
І, прад вачыма, палахліва
Устае мінуўшчына, як дзіва,
З забытых кніг, нібы з магіл.
Хай князь, хай кат,
хай губернатар,
Кладу жыццё іх на далонь,
І пранясу ля кожнай хаты
І людзі ўбачуць: кроў і краты
І цмяны ладана агонь.
Праявай спадчыну, сталіца,
Тваіх вякоў сівую быль,
Пусціў я нанач за пранёцу
Хай нашым ворагам прысніцца,
А з ёй, як герб, яе кастыль!

3

Быў ліпень месяц год дваццаты,
На барыкадах і касцях —
Тваёй гісторыі пачатак,
Пачатак нашага жыцця.

Сляды калоній гапебнай
Мы выкарчоўваем упчэнт.
Размах у шыр і ўвысь патрэбны
Табе, мой родны, Новы Менск.

Маім імкненням заўтра збыцца:
Як знік у нас гарадавы —
Не будзе знаць мая сталіца
Ні сутарэнняў, ні царквы!

4

Раскрый свае вароты насцеж,
Плывуць страі крылатых мар
Сустрэцца з будучынай шчасця
Пад гукі сонечных фанфар.

Як воўк, стаў выць варожы вецер
Ты-ж, як застава, на мяжы.
Я не знайду людзей на свеце
Якім было-б так добра жыць!

Калыску росквіта над краем
Народ падняў вітаць вясну.
А там... на Захадзе—ўздымаюць
Пад стогны голада—труну!

5

Красуй, совецкая сталіца,
Твой бурны дзень, твой горды рух,
Твой стан, як помнік большэвіцкі
Гадам свінцовых завірух!

Лістапад, 1934.

ПРЫ ВЯЛІКАЙ АКТЫЎНАСЦІ МАС

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону).

На вялікай палітычнай вышыні праходзіць справаздачна-выбарчая кампанія горсовета ў Віцебску.

— Такой дзелавой актыўнасці, такога палітычнага ўздыму ў масах выбарчыкаў, — дзяліўся ўражаннямі старшыня гарадской выбарчай камісіі тав. **Аверын,** — не было ні пры якой іншай кампаніі.

На сходы ідуць арганізаванна, са сцягамі, транспарантамі, партрэтамі правадыроў. Парадак узорны. Яўка — звыш 90 проц. Абгаварэнне работы горсовета і наказу новаму горсовету выключна актыўнае і дзейнае.

На заводзе «Чырвоны металіст» 21 лістапада з'явілася 99,6 проц. выбарчыкаў. Там-жа было ўнесена 250 прапаноў у наказ. На выбарчы сход лесазавода імя «Правды» з'явілася 100 проц. выбарчыкаў. За першыя два дні выбараў — 20 і 21 лістапада — было 11 сходаў па гораду і чыгуначнаму вузлу. Агульная яўка — 90 проц. Калі дадаць да гэтага лік неэ'явіўшыхся па ўважлівых прычынах (хвароба, работа на пасту і т. д.), то процант яўкі будзе значна вышэйшы. Жанчын прымала ўдзел у выбарах за гэтыя два дні 94 проц.

Асноўныя дадаткі да наказу новавыбранаму горсовету гэта пытанні паляпшэння комунальнага будаўніцтва, культурна-бытавога абслугоўвання.

— Адкрыць пральню.

— Забружаваць і асвяціць вуліцы.

— Пашырыць школы.

Падобныя прапановы амаль на ўсіх наказах.

Трэба адзначыць як станоўчы факт, што горсовет, не чакаючы канца выбараў, ужо зараз выконвае рад патрабаванняў выбарчыкаў.

Так, рабочыя лесазавода № 13, жывучыя ў асобным рабочым Маркаўшчына, патрабавалі, каб трамвай хадзіў не да 12 гадзін ночы, а да 2-х.

— У тэатр пойдзеш, — заявілі яны, дык і сям не рад: пехатой потым цягнися такую даль.

Горсовет гэта законнае патрабаванне задаволіў. Абошні трамвай зараз адгрэўлецца па Маркаўшчыну ў 2 гадзіны ночы.

Такіяж патрабаванні былі і з боку рабочых фабрык «КІМ» і «Дзвіна». Яны таксама ўжо задаволены.

Падобных прыкладаў можна было-б прывесці значна больш. Прыняцце канкрэтных мер па прапановах выбарчыкаў выклікае яшчэ большую актыўнасць і зацікаўленасць у абгаварэнні работы горсовета і наказу. За першыя два дні выбрана 40 дэпутатаў і 13 кандыдатаў, у тым ліку жанчын адпаведна 16 і 7. Абгаварэнне кандыдатур вельмі актыўнае. Выбіраюць дасюль зарэкамендаваўшых сябе актыўных ударнікаў.

Р. Д.

ПАЛАЖЭННЕ АБ ВАЕННЫМ СОВЕЦЕ ПРЫ НАРКОМЕ АБАРОНЫ САЮЗА ССР

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

1. Ваенны Совет з'яўляецца дарадчым органам пры народным камісару абароны Саюза ССР.

2. Старшынёй Ваеннага Совета з'яўляецца народны камісар абароны Саюза ССР.

Члены Ваеннага Совета зацвярджаюцца Советам Народных Камісараў Саюза ССР па прадстаўленню народнага камісара абароны Саюза ССР.

3. Ваенны Совет разглядае пытанні, пастаўленыя на яго абмеркаванне народным камісарам абароны Саюза ССР, а таксама і тыя пытанні, якія высоўваюцца членамі Совета.

4. Тэрміны склікання і павестка пасяджэнняў Ваеннага Совета ўстанаўліваюцца народным камісарам абароны Саюза ССР.

5. Усе рашэнні Ваеннага Совета зацвярджаюцца народным камісарам абароны Саюза ССР і праводзяцца ў жыццё яго загадамі і распараджэннямі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Крэмль.
22/XI-34 г.

АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ СКЛАДУ ВАЕННАГА СОВЕТА ПРЫ НАРОДНЫМ КАМІСАРУ АБАРОНЫ САЮЗА ССР

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ ССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Зацвярдзіць наступны склад Ваеннага Совета пры народным камісару абароны Саюза ССР:

1. **ВАРАШЫЛАЎ К. Е. — народны камісар абароны Саюза ССР (старшыня Ваеннага Совета).**

2. **ГАМАРНІК Я. Б. — першы намеснік народнага камісара абароны Саюза ССР.**

3. **ТУХАЧЭЎСКІ М. Н. — другі намеснік народнага камісара абароны Саюза ССР.**

4. Аркісіс Я. І. 5. Амелін М. П. 6. Апанасенка І. Р. 7. Апога Э. Ф. 8. Апанштам Л. Н. 9. Баранаў М. І. 10. Белоў І. П. 11. Берзін Я. К. 12. Блюхер В. К. 13. Будзённы С. М. 14. Булін А. С. 15. Васіленка М. І. 16. Веклічоў Г. І. 17. Веліканаў М. Д. 18. Вінтераў М. В. 19. Гаппер Л. М. 20. Гаркавы І. І. 21. Гайліт Я. П. 22. Германовіч М. Я. 23. Гарадзейкоў О. І. 24. Грыбаў С. Е. 25. Грышын А. С. 26. Грэзнеў І. К. 27. Гугід Г. І. 28. Дубовой І. Н. 29. Дыбенка П. Е. 30. Егораў А. І. 31. Ефімаў П. А. 32. Інгаўніс Ф. А. 33. Іппо Б. М. 34. Казанскі Е. С. 35. Каменеў С. С. 36. Кашырын Н. Д. 37. Кожанаў І. К. 38. Корк А. І. 39. Купік Г. І. 40. Кучынскі Д. А. 41. Лапін А. Я. 42. Левандоўскі М. К. 43. Левічоў В. Н. 44. Межэнінаў С. А. 45. Мезіс А. І. 46. Мерэцкоў К. А. 47. Обысаў С. П. 48. Окунеў Г. С. 49. Орлоў В. М. 50. Ошлей П. М. 51. Осепян Г. А. 52. Пецін Н. Н. 53. Пракоф'ей А. П. 54. Рагоўскі Н. М. 55. Сенгурскі М. В. 56. Седякін А. І. 57. Сінілўскі Н. М. 58. Славін І. Е. 59. Смірноў П. А. 60. Сміраў Р. А. 61. Тімашэнка С. К. 62. Ткачоў І. Ф. 63. Тэворскі А. І. 64. Тураўскі С. А. 65. Убарэвіч І. П. 66. Урыцкі С. П. 67. Федько І. Ф. 68. Фельдман Б. М. 69. Фішман Я. М. 70. Халепскі І. А. 71. Хрыпін В. В. 72. Хрулеў А. В. 73. Шепелінкаў Б. М. 74. Шастакоў В. Н. 75. Шыфрэс А. Л. 76. Штэрн Г. М. 77. Эйдэман Р. П. 78. Якір І. Э. 79. Ярцаў А. П. 80. Ястрабаў Г. Г.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР —
В. МОЛАТАЎ.

Нам. кіраўніка справаў Совета Народных Камісараў Саюза ССР
І. МЕЖЛАУК.

Масква, Крэмль.
22 лістапада 1934 г.

Т. т. МОЛАКАЎ, БАБУШКІН І КРЭНКЕЛЬ НА БАЎСНАЎШЧЫНЕ ШМІДТА

МАГІЛЕЎ, 25. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

На радзіму Шмідта прыехалі тры адважныя заваявальнікі Арктыкі: герой Совецкага Саюза тав. **Молакаў**, старэйшы пілот поўначы тав. **Бабушкін** і лепшы радыст-палярнік тав. **Крэнкель.**

Некалькі тысяч рабочых, студэнтаў і служачых Магілева з самай раніцы прышлі па вакзал сустракаць герояў.

Днём у гонар слаўных удзельнікаў чэлюскінскай эпапеі працоўныя Магілева арганізавалі вялікую дэманстрацыю.

24 лістапада ўвечары госці выступалі ў Доме Чырвонай Арміі, на сходзе камандна-палітычнага складу II-скай дывізіі. Яны расказалі камандзірам аб слаўнай эпапеі «Челюскина».

Тт. Молакаў, Бабушкін і Крэнкель прабудуць у Магілеве тры дні. Яны давядуцца рад заводаў і фабрык горада.

ЗІТ. ДАЛЬ.

АБ ХОДЗЕ СПРАВАЗДАЧНАЙ КАМПАНІІ ПА МЕНСКАМУ ГАРАДСКОМУ СОВЕТУ

Пастанова бюро Менгаркома КП(б)Б ад 23 лістапада 1934 г.

1. Зацвердзіць рашэнне гарадской выбарчай камісіі ад 23 лістапада аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

2. Падкрэсліваючы, што справаздачныя сходы па большасці прадпрыемстваў і ўстаноў праходзяць пры здавальняючай яўцы на сходы і высокай палітычнай актыўнасці выбаршчыкаў, бюро гаркома КП(б)Б побач з гэтым адзначае гакебны зрыў справаздачнага сходу на электрастанцыі (1-й і 3-й змены), што з'яўляецца вынікам адсутнасці адпаведнай палітмасавай работы з боку партыйных і профарганізацый, за што сакратару парткома электрастанцыі тав. **КУРЯНУ** і старшыні МК тав. **КОХАНАЎСКАМУ АБВЯСЦІЦЬ СУРОВУЮ ВЫМОВУ** з папярэджаннем аб зняцці іх з работы.

3. Загадчыку дамамі жыл. зем. кіраўніцтва, члену партыі, тав. **КРЫГЕРУ** за дапушчэнне злачынна-нядбайных адносін да складання спісаў выбаршчыкаў, якія (адносіны) выразіліся ў хуліганскім скажэнні прозвішч выбаршчыкаў—**АБВЯСЦІЦЬ СУРОВУЮ ВЫМОВУ.**

4. Адказнаму за складанне спісаў выбаршчыкаў па Галоўдортрансу, члену партыі тав. **ТАРАСЕВІЧУ** за дапушчэнне ўключэння ў спіс выбаршчыкаў лішэнца—**АБВЯСЦІЦЬ ВЫМОВУ.**

5. За нядбайнасць пры складанні спісаў выбаршчыкаў дырэктарам тэхнікума сувязі тав. **НІКАЛАЕВУ**, Ментрамвайтроста тав. **ПЯТРУХІНУ**—**ПАСТАВІЦЬ НА ВІД.**

Пытанне аб дырэктары Ленпартгарадка тав. **ЛАРАЧКІНЕ** абгаварыць асобна па яго прыездзе.

6. Для узмацнення палітмасавай работы сярод неарганізаванага насельніцтва мабілізаваць дадаткова 700 комуністаў і комсамольцаў з вучэбных устаноў і прапанаваць гаркому КСМ мабілізаваць 300 комсамольцаў. Ускласці на партарганізацыі заводаў і фабрык, шэфствуючых над жактамі, таксама адказнасць за правядзенне палітмасавай работы па справаздачна-перавыбарчых сходах у жактах.

7. Бюро гаркома КП(б)Б папярэдзіць усіх сакратароў парткомаў, парторгаў, старшынь ФЗМК і кіраўнікоў прадпрыемстваў і устаноў, што за малейшы зрыў і непадрыхтаванасць справаздачна-выбарчых сходаў, за неахайныя адносіны да пытанняў, звязаных з выбарамі ў советы—дым будуць прыцягвацца да пакаранняў партыйнай адказнасці, як за нерасцэненне такой важнай палітычнай кампаніі як выбары ў советы.

Нам. сакратара ГК КП(б)Б
ХАДАСЕВІЧ.

Л. М. КАГАНОВІЧ

Аб унутрыпартыйнай рабоце і аддзелах кіруючых партыйных органаў*)

Месца аддзелаў кіруючых парторганаў у партыйным апараце

I.

Аддзелы кіруючых партыйных органаў — новыя аддзелы ў партыйным апараце. Яны створаны рашэннем XVII з'езда партыі.

Усякая перабудова апарата, лаючы апрамадныя плюсы ў рабоце, звязана і з накладнымі расходамі. Пакуль ідзе гэта перабудова, пакуль людзі асвойваюць свае новыя функцыі, праходзіць час, і ў рабоце атрымліваецца замінка. Наша задача — звесці к мінімуму гэту замінку. Трэба, каб аддзелы кіруючых парторганаў быстрэй асвоілі свае функцыі. А да гэтага часу яны не разгарнулі па-сапраўднаму работы. З раду выступленняў на вашай паралзе відаць, што на месцах яшчэ няма поўнай яснасці ў пытанні аб функцыях аддзелаў кіруючых партыйных органаў, аб адрозненні іх ад ранейшых аргінстраў і цяперашніх вытворча-галінавых аддзелаў абкомаў-крайкомаў.

База аддзелаў кіруючых парторганаў больш вузкая, чым у былых аргінстраў. Аргінстры займаліся арганізацыяй усіх і ўсяго. Звыш ста тысяч первічных партыйных арганізацый, або, як тады называліся, ячэек, прамысловых, сельскагаспадарчых, чырвонаармейскіх, устаноў, вузаўскіх, — усімі імі павінен быў займацца аргінстр. Гэта — функцыянальная сістэма пабудовы апарата. Яна была мэтазгодна і неабходна ў першынствовы арганізацыйны перыяд, калі арганізацыйная работа была больш простай, калі можна было яшчэ абыходзіцца агульнымі арганізацыйнымі палажэннямі, інструкцыямі і інш. Але потым работа ўсё больш ускладнялася, патрабавалася большая дыферэнцыяцыя ў рабоце. Адзін аддзел не ў сілах быў абслужыць усе віды партарганізацый.

XVII з'езд партыі ўстанавіў такую структуру партыйнага апарата, пры якім партарганізацыямі прамысловых прадпрыемстваў займаецца прамысловы аддзел, партарганізацыямі соўгасаў, калгасаў — сельскагаспадарчы аддзел, партарганізацыямі транспарта — транспартны аддзел і т. д. Гэтыя вытворча-галінавыя аддзелы партыйных камітэтаў павінны спалучаць кіраўніцтва гаспадарчай і партыйнай работай, займаючыся ў першую чаргу партыйнай работай пад кутом тых гаспадарчых задач, якія стаяць перад той ці іншай партарганізацыяй.

Але апрача первічных партарганізацый заводаў, калгасаў, устаноў, станцый і інш. ёсць кіруючыя імі тэрытарыяльныя органы—райкомы, гаркомы, абкомы, а таксама палітаддзелы, якія, як указаў XVII партз'езд, будуць па меры выканання сваіх ударных задач ператвараецца ў звычайныя партыйныя органы, пабудаваныя па вытворча-тэрытарыяльнай прымеце. Райкомаў і гаркомаў па Совецкаму Саюзу каля трох тысяч. Трэба кіраваць імі, кантраляваць іх работу. Для дапамогі абкомам, крайкомам, ЦК у аператыўным кіраўніцтве райкомамі і гаркомамі створаны аддзелы кіруючых партыйных органаў.

Дапамагаючы кантраляваць работу райкомаў і гаркомаў, аддзелы кіруючых парторганаў тым самым дапамагаюць абкомам і крайкомам правяраць работу і іх вытворчых аддзелаў. Гэтым смушчацца не трэба. Узаемакантроль ёсць першая ўмова нармальнай работы. Дрэнная тая сістэма арганізацыі, у якой кожная клетачка не звязана з другой, існуе ізаляванa. Жыццё кантралюе нас, калі б'е за дрэнную работу. Але задачы кіраўніцтва заключаюцца ў тым, каб загадзя папярэдзіць прарывы, выправіць недахопы.

II.

Якія патрабаванні прад'яўляюцца к аддзелам кіруючых парторганаў у першую чаргу? Уважліва вывучаць і добра ведаць стан кожнай раённай і гарадской партарганізацыі, работу кожнага райкома і гаркома, а для аддзела кіруючых парторганаў ЦК ВКП(б) — абкома і крайкома. Вывучаць і ведаць кадры гарадскіх і раённых работнікаў. Своечасова ставіць перад партыйнымі камітэтамі пытанні аб недахопах у рабоце той ці іншай партарганізацыі, таго ці іншага работніка.

Нават добры работнік, калі яго сістэматычна не кантраляваць, не крытыкаваць яго недахопы, час-ад-часу не «праціраць анучкай ад пылу, які на яго садзіцца», можа сапсавацца «заплесні́вець». Каб не губіць работніка, трэба яго своечасова папярэджваць аб яго недахопах.

Раённыя работнікі працуюць многа. Ніхто не можа папракнуць раённічыкаў, што яны працуюць мала. Але часта раённых работнікаў захлёствае цякучка. Ранцою атрымае адно заданне, днём тэлеграму па другому пытанню, к вечару ўзнікае яшчэ рад новых пытанняў. Ён, небарака, кідаецца ад аднаго пытання к другому, упускаючы часамі асноўнае. Ён не паспявае прадумаць, а з-за гэтага часта траціць перспектыву ў рабоце. Калі своечасова прыйдзі к такому работніку і растлумачыць, што тут ты прамігаў тое і тое, што трэба пастуціць так і так і не проста вылаяць і загадаць ямі, а растлумачыць, распырыць яго кругавід, то гэта значыць выратаваць і работу і чалавека, гэта значыць падняць работніка на ступеньку вышэй.

Патрэбны не сенсацыі, не толькі эпізадычныя наскокі на тую ці іншую партыйную арганізацыю, а арганічная, штодзённая, чарнавая, крапатлівая работа партыйнага апарата. Трэба, каб быў апарат, які будзе сістэматычна чытаць «сумныя» пратаколы, які, прачытаўшы 100 пытанняў, прапусціць 90 або пават 98, як правільныя але два пытанні, паложым, зачэпіць, як няправільныя, і скажа аб гэтым ЦК партыі (або, аднаведна, свайму абкому — крайкому). Гэтым адным такі аддзел апраўдвае сваё існаванне, як апарат, які калёсікамі свайго механізма зачапляе ўсё нягоднае, добрае падтрымлівае, а нягоднаму не дае ходу.

Для чаго нам гэта патрэбна? Гэта нас гарантуе ад таго, каб мы не спахватваліся занадта позна з поводу той ці іншай партарганізацыі. Напомню прыклад пензенскай арганізацыі. Хвалілі яе кругом, работнікі крайкома ездзілі ў Пензу, але ездзілі наскокам, не выяўлялі зародкаў недахопаў. І выкрылі недахопы толькі тады, калі выперла ўжо яўнае разлажэнне часткі кіруючага актыва. Калі-б аддзел кіруючых парторганаў Сярэдневолжскага крайкома не «наогул» вёў работу пензенскага гаркома, а дакладна яе вывучаў, чытаў уважліва кожны дакумент, то ён своечасова сігналізаваў-бы крайкому аб першых адзнаках разлажэння, якія потым выраслі ў агіднейшыя факты.

Аддзел павінен быў прыйсці к сакратарам крайкома і сказаць: некаторыя краявыя работнікі хваляць Пензенскі гарком, у яго сапраўды ёсць дасягненні, але звярніце ўвагу, што ў яго ёсць адзнакі самасупакоенасці, самейнасці і кругавой парукі, нелюбові да самакрытыкі. І калі-б своечасова звярнулі на гэта ўвагу, з'ездзілі-б у Пензу, глыбей вынучылі справу, вы правілі-б недахопы ў самым іх зародку, то не трэба было-б ужываць такіх крутых мер, не трэба было-б так моцна крытыкаваць пензенскую партарганізацыю і караць тав. Ільіна, які быў у свой час перадавым работнікам.

Таварыш **Сталін** сістэматычна вучыць нас таму, што партыя не можа будаваць сваю работу на аснове слепога давер'я, без праверкі і без самакрытыкі. Любы чалавек, будзь ён сямі пядзей ва лбе, будзь ён самым выдатным чалавекам, калі вы яго паставіце ва ўмовы поўнай бескантрольнасці, слепа давяраючы яму, паставіце ва ўмовы сістэматычных пахвал і адсутнасці крытыкі, ён сапсуецца, зазнаецца, немінуча скоціцца ўніз. Няма ідэальных людзей, людзей без недахопаў. Мы крытыкуем не толькі дрэнных работнікаў, мы крытыкуем і добрых работнікаў за іх недахопы і тым падтягваем іх на ступеньку вышэй, перасцерагаем іх ад скочвання ўніз.

III

Партыя патрабуе ад аддзелаў кіруючых парторганаў дакладнага вывучэння і глыбокага ведання раённага і гарадскога актыва. Гэта датычыць у першую чаргу аддзелаў крайкомаў і абкомаў. Аддзел кіруючых парторганаў ЦК павінен ведаць раённы актыў праз аддзелы кіруючых парторганаў, крайкомаў і абкомаў.

Трэба дабіцца, каб аддзел кіруючых парторганаў ведаў у кожным раёне свайго края або вобласці па 10-15 работнікаў, ведаў не толькі па анкетах і асабістых справах (і іх трэба ўважліва вывучаць), але і па рабоце, на аснове асабістых гутарак, праверкі на месцы.

Аддзелы кіруючых парторганаў павінны ведаць не толькі раённых работнікаў, але і работнікаў палітаддзелаў. XVII партз'езд даручыў ЦК «у сувязі са стварэннем новых эканамічных цэнтраў вакол МТС, ствараць новыя самастойныя раёны або ў менш магутных цэнтрах МТС падраёны, а палітаддзелы МТС па меры неабходнасці ператвараць у райкомы або падрайкомы». Палітаддзельскія работнікі зараз, як члены бюро райкомаў, а ў будучым як работнікі райкомаў і падрайкомаў, з'яўляюцца асноўнымі кадрамі нашых аддзелаў кіруючых парторганаў.

Зараз усюды чуеш скаргі — няма работнікаў. Раней, калі ў нас былі губерні і паветы, то паветы падрыхтоўвалі кадры для губерань. Цяпер павітовыя і акруговыя работнікі распыліліся па больш чым 2,5 тысячах раёнаў. Людзі ёсць, але іх дрэнна вывучаюць, мала вы соўваюць, лічачы часамі, што занадта вялікі скачок з раёна ў вобласць або край. Гэта няправільна. Таварыш **Сталін** вучыць нас смялей высоўваць людзей, добра праяўшых сябе на практычнай рабоце. Трэба дапамагчы партыі высоўваць лепшых людзей, падтрымліваць іх у рабоце. Гэта—вялікая справа. Але высоўваць або падтрымліваць можна толькі на аснове добрага ведання гэтых работнікаў.

Неабходна к раёнам і раённым работнікам праяўляць асаблівую ўважлівасць, не падыходзіць лёгкаважна, па шаблону «рубіць зплеча».

Калі бачыш, што работнік чэсны, працуе добрасумленна, але ў яго здарыўся прарыў або памылка, трэба біць, крытыкаваць, але адначасова трэба дапамагчы выправіць памылку, дапамагчы падняцца на ногі. Такі канкрэтны індывідуальны, таварыскі падыход магчымы толькі на аснове добрага ведання работнікаў, уважлівага, сістэматычнага вывучэння іх работы. Трэба, каб работнік ведаў, што любая яго памылка, адхіленне ад лініі партыі не пройдуць беспакарана, але ў той-жа час раённічык павінен быць упэўнен, што яго работу ведаюць, цэняць, што калі ён працуе чэсна, добра, то выпадковая памылка або правал не закрэсляць яго ранейшай работы, не прывядуць к нечаканай яго катастрофе.

Ведаючы дасканала кожны раён, аддзелы кіруючых парторганаў змогуць дапамагаць і вытворчым аддзелам ставіць работу па-сапраўднаму і, галоўнае, аператыўна. Трэба прызнаць, што зараз многія вытворчыя аддзелы некалькі аднабакова вядуць сваю работу, больш увагі аддаюць гаспадарчым пытанням, а пытанні партыйнага жыцця, унутрыпартыйнага будаўніцтва ў іх астаюцца ў баку. Сваёй работай аддзелы кіруючых парторганаў павінны дапамагаць крайкомам і абкомам выпраўляць гэту аднабокасць, гэтыя недахопы ў рабоце вытворчых аддзелаў.

Нельга ні на мінуту забываць, што ў цэнтры работы партыйнага апарата павінны быць пытанні партыйнай работы. Па ўсіх-жа іншых пытаннях вядзе работу совецкі, камэратыўны, профсаюзны апарат. А партыйнай работай ніхто, апрача партыйных камітэтаў, не займаецца. За стан партыйнай работы партыйны апарат адказвае непасрэдна, калі так можна сказаць, юрыдычна. З другога боку, якую-б галіну работы не ўзяць,— няхай гэта капітальнае будаўніцтва, сяўба, загатоўкі, школьная справа і інш.—уся гэта работа праводзіцца жывымі людзьмі і комуністамі як перадавікамі, як авангардам у першую чаргу. Без комуністаў, без іх партыйнай арганізацыі ніякай справы не арушыш, не вырашыш. Партыйны апарат павінен падыходзіць да вырашэння дзяржаўных і гаспадарчых пытанняў перш за ўсё праз разгортванне работы сярод членаў партыі, шляхам арганізацыі комуністаў і беспартыйнага актыва на вырашэнне тых ці іншых задач.

Калі вы прагледзіце пратаколы нашых абкомаў і крайкомаў то пераканаецеся, што непасрэдныя практычныя пытанні работы таго ці іншага райкома амаль не ставяцца і наогул занадта мала разбіраюцца чыста партыйна-арганізацыйныя пытанні. «Нудпавата» як быццам займацца гэтымі будзённымі пытаннямі. І толькі тады, калі пачынае «пахнуць смажаным», калі раён пападае ў прарыў, тады ўсе пачынаюць займацца гэтым раёнам. Такое становішча сведчыць, што аддзелы кіруючых парторганаў не вядуць яшчэ як належыць арганічнай работы і не праяўляюць настойлівасці ў пастаноўцы сваіх пытанняў на бюро. Калі аддзел кіруючых парторганаў выявіў тое ці іншае вострае пытанне ўнутрыпартыйнай работы, ён павінен праявіць настойлівасць і дабіцца вырашэння гэтага пытання абкомам або крайкомам. Я не заклікаю к выяўлячасці супроць сакратароў абкомаў (смех), я сам сакратар абкома, але справа ў тым, што кожны пастаўлены на сваю справу павінен любіць яе, умець дабівацца вырашэння сваіх пытанняў.

Вось, прыкладна, тое, што патрабуецца ад аддзелаў кіруючых парторганаў. **Галоўная задача аддзелаў—быць памочнікам сакратароў абкомаў—крайкомаў па аператыўнаму кіраўніцтву гаркомамі і райкомамі, своечасова ўказваць, дзе дрэнна, што трэба выправіць, або выцягваць добра працуючыя райкомы як узоры.**

Аб інструктарах райкомаў і абкомаў

Інструктары пасля XVII з'езда партыі павінны стаць важнейшым звяном, калі можна так сказаць, цэнтральнай фігурай партыйнага апарата. Павінны стаць, але яшчэ далёка не сталі. І гэта не таму, што работнікі слабы, а галоўным чынам таму, што не знайшлі яшчэ сабе месца—сваёй «палічкі», як належыць не асвоілі сваіх функцый.

У рабоце большасці інструктароў пераважае яшчэ цякучка, стыхія іх захлёствае і ператварае рад інструктароў у штурхачоў і хадатаяў прадпрыемстваў і калгасаў па гаспадарчых пытаннях перад раённымі і абласнымі органамі.

Многія інструктары не вызначылі яшчэ сваёй ролі ў апараце—ці то яны кантралёры, ці то кансультанты, ці то складальнікі запісак і «сігналізатары». Інструктар яшчэ не выдзяляе галоўных звенняў у сваёй рабоце: якое прадпрыемства ў яго вядучае, за што трэба ўхапіцца на кожным прадпрыемстве.

Між тым роля інструктароў асабліва вялікая і адказная. Усе мы ведаем цану рашэнням, запісаным на паперы, калі няма людзей, якія прасоўваюць і кантралююць выкананне гэтых рашэнняў. **Інструктары павінны быць байцамі за выкананне рашэнняў партыйных камітэтаў, яны павінны быць звязуючым звяном паміж первічнымі партарганізацыямі і райкомамі—гаркомамі.** Інструктар павінен умець прыкоўваць увагу кіраўнікоў партыйнай арганізацыі к пастаўленым ім пытаньням. Ва ўсіх нас безліч работы, усім няма часу, многіх засмоктвае цякучка, але інструктар павінен так ставіць пытанні сваіх первічных партарганізацый, каб прыкаваць увагу сакратара і бюро партыйнага камітэта к сапраўды вострым і важным пытаньням.

Трэба пільна падбіраць інструктароў, знішчаць усякую выпадковасць і неахайнасць у падборы, не дапускаць цякучасці інструктарскага складу. Інструктар павінен быць упэўнен, што калі ён 2-3 гады прапрацуе ў сябе ў раёне і пакажа добра, то ён мае перспектыву на далейшае вылучэнне, а для гэтага яго трэба ведаць.

Асноўнай задачай інструктароў райкомаў і гаркомаў павінна быць належная пастаноўка ў первічных партарганізацыях арганізацыйна-партыйнай і ідэйна-палітычнай работы. У цэнтры ўвагі інструктара павінен быць член партыі, яго ідэйнае ўзбраенне і павышэнне яго авангардной ролі на вытворчасці і ў грамадска-палітычным жыцці. Інструктар павінен уважліва адносіцца да такіх пытанняў, як рост партыйнай арганізацыі, пастаноўка ўліку комуністаў, практыка накладання партыйных спагнанняў, забяспечваючы ўважлівыя, чулыя адносіны з боку партыйных арганізацый да кожнага асобнага члена партыі. Інструктар павінен ведаць не толькі партыйны, але і беспартыйны актыў абслугоўваемых ім прадпрыемстваў, прымаць удзел у падборы, расстаноўцы і вылучэнні кадраў, працаваць над стварэннем рэзерва работнікаў.

Інструктар абавязан быстра рэагаваць на ўсе пытанні і сігналы комуністаў, рабочых і калгаснікаў, смела ўскрываць недахопы работы ўсіх арганізацый, не дапускаючы змазвання або прыкрыцця недахопаў, і прымаць разам з партыйнымі арганізацыямі неабходныя меры да іх знішчэння.

Асноўны метад работы інструктара—жывая сувязь з партарганізацыямі. Не менш двух трацяй свайго часу інструктар павінен праводзіць у первічных партарганізацыях. І тут інструктар павінен унікаць двух крайнасцей: першая—ператварыцца ў агента первічных партарганізацый, у штурхача пераважна па гаспадарчых пытаннях перад раённымі ці абласнымі органамі, і другая—падмяняць сакратара первічнай партарганізацыі, звязаць яго ініцыятыву, ператварыць яго ў пакіталт як у свайго памочніка, даручэнца.

Памылковы спробы некаторых інструктароў вырашаць усе пытанні сваімі сіламі. Інструктары павінны дзейнічаць праз партарганізацыі і прыводзіць у рух апараты совецкіх, гаспадарчых, камэратыўных, прафесіянальных, комсамольскіх арганізацый, імкнучыся падыйсці да вырашэння гаспадарча-палітычных пытанняў шляхам палітычнай мабілізацыі мас і арганізацыі комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных рабочых і калгаснікаў.

Асноўнае ў рабоце партыйнага апарата—арганізацыя і ўздым ідэйнага ўзроўню членаў партыі

I.

Некаторыя работнікі не зразумелі сутнасці перабудовы работы партарганізацый, устаноўленай XVII з'ездам, не зразумелі, што цэнтрам гэтай перабудовы з'яўляецца член партыі, яго ідэйнае ўзбраенне, яго палітычны рост і актыўнасць. XVII з'езд партыі спрасціў арганізацыйную структуру партыйных арганізацый, у прыватнасці ліквідаваў аддзелы ў парткомах, бюро цэхавых ячэек і т. п., іменна для таго, каб знішчыць ліпшія пагрэмаджэнні паміж членам партыі і партыйным камітэтам, пагрэмаджэнні, перашкаджаўшыя партыйнаму камітэту непасрэдна, чула і гібка абслугоўваць кожнага члена партыі.

Пры праядзенні перабудовы пасля з'езда ў некаторых арганізацыях сказіл асноўную сутнасць рашэнняў з'езда, абмежаваўся замяненнем формы, а то і проста перамонай шыльдаў, не перабудоўваючы работы па сутнасці. З аднаго боку—штампы, з другога—арыгінальнічанне, пагоня за новымі арганізацыйнымі формамі ва ўрон зместу,—такавы асноўныя недахопы ў рабоце раду партыйных арганізацый. У тым і другім выпадку выпустошваецца сутнасць партыйнай работы—ідэйная загартаванасць, мабілізацыя на галоўныя задачы членаў партыі на аснове самакрытыкі.

Пасля з'езда партыі мы заслухоўвалі некалькі раз у ЦК пытанні партыйнай перабудовы. І выяснілася, што ва многіх месцах перабудова праходзіць фармальна. Не сталі скліканць пасяджэнні бюро цэхавых ячэек—завялі дзённікі цэхавых партарганізацый. Калі «палітняма дзённікаў, то завялі «палітняма дзённікаў» (смех) або выдалі таўпарады» (смех) або выдалі таўшчэзную кнігу нагрузак кожнага члена партыі. І вінавы партработнік ператвараецца з палітычнага арганізатара ў статыстыка, сядзіць і зазтара ў статыстыка, сядзіць і зазтара ў статыстыка, сядзіць і пісае нагрузкі і перагрузкі (смех).

Многа штампу, фармальнасці назіраецца і ў такой галіне, дзе іх, здавалася, не павінна быць зусім, — у галіне ідэйнага ўзбраення, выхавання членаў партыі. Вы ўсе памятаеце, як ЦК ВКП(б) прорэка асудзіў такія формы працы працоўкі рашэнняў XVII з'езда, як палітлагеры, палітвудачкі, палітфанты, такія «маскарады», як вымышленыя «інтэрнацыянальныя канферэнцыі», дзе арганізацыйная шумліха і трасцатня, арыгінальнічанне, імкненне пераўзяць свет новымі арганізацыйнымі прыкмі падмянялі спакойнае, удумлівае вывучэнне асноўных партыйных рашэнняў, падмянялі сістэматычную, паглыбленую работу па асвоенню комуністамі асноў марксізма-ленінізма.

Таварыш Сталін на XVII з'ездзе партыі чотка вызначыў нашы задачы ў галіне ідэйна-палітычнай работы:

«1) Узняць тэарэтычны ўзровень партыі на належную вышыню;

2) Узмацніць ідэалагічную работу ва ўсіх звеннях партыі;

3) Весці настойную прапаганду ленінізма ў радах партыі;

4) Выхоўваць партарганізацыі і акружаючых іх беспартыйны актыў у духу ленінскага інтэрнацыяналізма;

5) Не замазваць, а крытыкаваць смела адхіленні некаторых таварышоў ад марксізма-ленінізма;

6) Сістэматычна выкрываць ідэалогію і астаткі ідэалогіі варожых ленінізму плыняў».

З гэтага мы павінны выходзіць ва ўсёй сваёй рабоце.

Партыйная работа, няма сумнення, значна разгарнулася за апошнія гады, узнялася свядомасць людзей, але яшчэ шмат шаблону ў партыйнай рабоце і, у прыватнасці, у арганізацыі і правядзенні парт і палітдзён.

II.

Што такое партыйны дзень у маскоўскай, ленінградскай або ва ўсякай іншай партыйнай арганізацыі? Гэта значыць, што дзесяр тысяч комуністаў, або ва ўсякім выпадку дзесяткі тысяч комуністаў — перадавых людзей, цвет работага класа — збіраюцца ў адзін пэўны дзень і накіроўваюць лепшае, што ў іх ёсць: свае мыслі, думы, прапановы на вырашэнне пэўных пытанняў. Падрыхтоўка такога дня — святая справа. А між тым у нас вельмі часта гэта падрыхтоўка нязецца неахайна, перадаўляецца другарадным работнікам.

Як трэба падрыхтоўваць партдзень па-сапраўднаму?

Па-першае, трэба прадумаць павестку партдня. Не заўсёды патрэбна і матэгодна назначаць сходы ў адзін дзень. Часамі лепш на адной групе прадпрыемстваў правесці сходы, дапусцім, сёння, а на другой — заўтра або паслязаўтра. Не заўсёды мэтазгодна назначаць адзіную павестку. Дапусцім, у партарганізацыях ВНУ трэба было-б правесці партдзень у сувязі з пачаткам навучальнага года, а ў другіх арганізацыях можна правесці сходы па іншых пытаннях.

Варта крапатліва і добрасумленна вывучыць пытанні, затаваемыя дакладчыкам на сходах, варта пагутарыць з дзесяткам-другім рабочых на даным прадпрыемстве, і выявяцца пытанні, цікавячыя рабочых. Вядома, не ўсе гэтыя пытанні можна і трэба ўключаць у павестку партдня, таксама як нельга абмяжоўваць павестку толькі пытаньнямі, якія ўзнімаюцца рабочымі, але крапатліва вывучыць і ўважліва прааналізаваць гэтыя пытанні, каб вызначыць павестку ўдумлівы, овтома, а не вольнай імправізацыяй, — гэта абавязак кожнага сур'ёзнага партыйнага кіраўніка.

У нас часта не дыферэнцыруюць пытаньняў партдня і палітдня, наладжваемага для ўсіх рабочых завода або членаў калгаса — партыйных і беспартыйных. Палітдні праводзяцца следам за партдняміі паўтараюць іх павестку. Так рабіць нельга. На партдзях трэба ставіць пераважна такія пытанні, якія проба загадзя абмеркаваць толькі сярод комуністаў. Не трэба кожны партыйны сход раяць адкрытым. Трэба, каб комуністы (а гэта датычыць у першую чаргу маладых комуністаў) прывыклі абгрунтаваць у сваім асяроддзі і загадзя абмяркоўваць хвалюючыя іх пытанні, перш чым выйсці з імі да рабочай масы. Пры такой пастаноўцы і аўтарытэт партыйных сходаў будзе вышэйшы.

Мы не можам паскардзіцца на вольнасць сходаў па прадпрыемствах. Сходаў праводзіцца многа, але якасць іх кульгае. Трэба скарацць ліч сходаў у два-тры разы, але так забяспечыць іх арганізацыю, каб кожны сход узнімаў удзельнікаў яго на пэўную ступень, а ў гэтых адносінах вялікае значэнне маюць падбор і інструктаванне дакладчыкаў.

Не заўсёды добра ў нас з падборам дакладчыкаў і іх падрыхтоўкай да дакладаў. У нас не падбіраюць дакладчыкаў хоць-бы з такой стараннасцю, як сакратароў парткомаў, парторгаў, як гаспадарнікаў. А дакладчык-жа фармуе свядомасць комуністаў. Ад дакладчыка ва многім залежыць, правільна ці блытана ўсвоюць сабраўшыяся тое ці іншае пытанне палітыкі партыі. Іншы раз памыленыя погляды, унушаныя дакладчыкамі, потым трэба выпраўляць на некалькіх сходах.

Нашы рабочыя сталі значна больш культурнымі, развітымі. Яны прад'яўляюць больш запатрабаванняў, чым раней, і запатрабаванняў больш складаных, больш тонкіх. Выраслі і кадры нашых талантлівых агітатараў, прапагандыстаў, дакладчыкаў з рабочых. Групавая агітацыя шырока разгарнулася, але каб гэтыя агітатар атчуваў слабе ўплывна, ён павінен быць на галаву вышэй, культурней тых, каго ён агітуе. На справе не заўсёды мы гэта маем. Дакладчыкі павінны ўзмоцнена над сабой працаваць, беспаратынна вучыцца расці.

Нашы работнікі завалены работай і, трэба прызнацца, часамі нават газеты прагледаюць па-хаду, са спазненнем, а жалкія артыкулы адкладваюць «на выходзлага дня». Прапусціў, скажам, такі работнік першае паведамленне аб пачатку забастоўкі ў Амстэрдаме, глядзіш, а наступныя паведамленні для яго ўжо незразумелы. Спытацца каго-небудзь, чаму адбылася забастоўка, у чым яе сэнс, неяк вальўка, яшчэ засмеюць. Вось ён і не адважваецца выступаць на сходах, — а раптам спытаюцца, і ён не зможа правільна адказаць.

Нашы актывісты значна выраслі як арганізатары, як гаспадарчыя людзі, як дзяржаўныя дзеячы. Але чаго ім часта не хапае? Не хапае сістэматычных ведаў, агульнай культуры, няма часу для самаадукацыі. У нас шмат работнікаў, якія не вучыліся ні ў якой школе, ні ў якім університэце. Але, рыхтуючыся сур'ёзна і глыбока да любога выступлення, яны дзень за днём, год за годам выраслі ў грамотных, адукаваных людзей, добрасумленна працуючых над сабой. Адкіл рыхтуецца паспех, па газетных матэрыялах, другі рыхтуецца глыбей, вывучае пытанне да карэняў і не толькі робіць больш змястоўныя даклады, але і сам з кожным дакладам узнімаецца на ступеньку ў сваім культурным і палітычным развіцці.

На дапамогу дакладчыкам павінны прыйсці партгабінеты, існуючыя ўжо рад год, але працуючыя, на жаль, слаба. Пасядзець у партгабінеты трэба моцных большэвікоў, задушэўных работнікаў, з якімі-б не пасаромеўся пагутарыць, атрымаць спраўку, параду і буйныя, салідныя дакладчыкі. Калі райкомы і абкомы з любоўю пастаўляць работу ў сваіх партгабінетах, яны зробяць вялікую культурную партыйную справу, якая патрэбна будзе кожнаму члену партыі, кожнаму прапагандысту і дакладчыку.

III.

На пасяджэннях партыйных камітэтаў мы абмяркоўваем пытанні якасці сяўбы, уборкі, якасці прамысловай прадукцыі, якасці совецкага гандлю. Але вольны рэдка абмяркоўваем якасць даклада на партыйных сходах, як правіла, сабраўшымся, якасць недахопы арганізацыі схода, дакладчыка і т. д. На партыйных камітэтах мы абмяркоўваем розныя гаспадарчыя планы, праект будаўніцтва і т. д. Гэта добра, але чаму-б нам таксама ўважліва не абмяркоўваць, напрыклад, праграмы нашых партыйных школ і гурткоў? Ці нельга загадзя абмяркоўваць на бюро партыйных камітэтаў, з выездам аўтараў, змест «блакнотаў агітатараў», праграм і т. д.? Чаму мы крытыкуем па партыйных камітэтах гаспадарнікаў, крытыкуем сакратароў парткомаў, але не крытыкуем аўтараў праграм, «блакнотаў агітатараў», дакладчыкаў? Такое-ж абмяркаванне пытанняў будзе ўзнімаць ідэйнае жыццё

(ПРАЦЯГ НА 3 СТАР.)

*) З прамовы на нарадзе загадчыкаў аддзелаў кіруючых партыйных органаў 3 верасня 1934 г. Гл. «Большевик» № 21.

КАНЕЦ ПРАМОВЫ Л. М. КАГАНОВІЧА

партарганізацый, будзе павышаць кваліфікацыю дакладчыкаў ды і ўсіх, прымаючых удзел у абмеркаванні гэтых пытанняў.

Адначасова трэба даць магчымасць актыву працаваць над сабой, забраўшаць час для вучобы.

Недахопы ў рабоце нашых партыйных арганізацый асабліва яркі праяўляюцца на прыкладах калгасных і саўгас сельскіх партарганізацый. Да гаспадарчых чы[illegible]ненняў нашы первічныя партарганізацыі на вёсцы падышлі пітальна і займаюцца імі нядрэнна (зразумела, і тут ёсць выключэнні). Але старана ідэйнага ўзбраення, уздыму культурнага ўзроўню членаў сваёй арганізацыі яшчэ кульгае. Пытаннем чыста партыйным, ідэйна-палітычным, растлумачэнню палітыкі нашай партыі, міжнароднай абстаноўкі не адводзіцца яшчэ належнай увагі.

Нашы сакратары, партыйныя работнікі, як практыка, сталі кампетэнтны ў гаспадарчых пытаннях. Трэба павялічваць, павялічваць веды і ў далейшым усё больш, але трэба таксама з любоўю сапраўднага партыйнага арганізатара, як крамаўліваму партыйнаму проту, уладзіць ва ўсе галіны партыйнай работы, з любоўю вывучаць становішча первічных партыйных арганізацый, вывучаць дынаміку складу партарганізацый, не перакладваючы ўсёй практыкі партыйнай работы (а ў партыйнай рабоце ўся без дысмэнты).

выключэння практыка — нават дробязі — сутальная палітыка) на плечы «спецыялістаў» гэтай справы.

Партыйную работу трэба любіць. Бюракратычныя, фармальныя элементы ў ёй злачынны ў далёка большай меры, чым у любой іншай рабоце, бо тут вы маеце справу з перадавымі людзьмі, цветам рабочага класа.

Мы маем шмат перамог і дасягненняў, але абстаноўка ў нас паравейшаму складаная, мы вядзем палітыку міру, але павінны быць гатовы кожную хвіліну адбіць напад імперыялістаў на нашу соцыялістычную радзіму. Перш за ўсё мы павінны мець ідэйна арганізаваны авангард пролетарыята — нашу партыю.

Некаторыя думаюць: раз кулака разбілі, ліквідацыі, моў, няма,— можна быць лібералам. Гэта няверна. Ворагі не спынілі барацьбы з намі, хоць і змянілі яе форму. Барацьба прадаўжаецца. Барацьба — гэта значыць, што кожны з нас у сваёй практычнай рабоце павінен быць непрымірымым большэвікам—ленінцам-сталінцам у барацьбе з недахопамі, якія ў нас ёсць, у барацьбе за ўдасканаленне работы, за тое, каб мы былі яшчэ больш узброены для выканання тых дырэктыў, якія даў нам XVII з'езд партыі, якія даў і дае нам наш першы арганізатар таварыш **Сталін! (Бурныя апла-**

выключаючы ня прадаўжайце». Адпору гэты кулацкі агент не атрымаў. Да рэчы, у гэтым калгасе ні адзін калгаснік да гэтага часу не прадаў наводнага кіло хлеба.

Класавы вораг працуе, а райком, РВК, палітаддзел не звяртаюць на гэта абсалютна ніякай увагі, не даюць адпору кулацкім манеўрам, накіраваным на зрыў дзяржаўных закупак хлеба.

МАЎЧАНСКІ.

ХЛЕБАЗАКУПКІ

НЕ ДАЮЦЬ АДПОРУ КУЛАЦКІМ МАНЕЎРАМ

Асобныя старшыні калгасаў Дубровенскага раёна злачынна ігнаруюць дзяржаўнае мерапрыемства па закупцы хлеба. Трэба прама сказаць, што раённыя партыйныя і совецкія кіраўнікі не рэагуюць на голы рад агітпасцей, накіраваных на зрыў дзяржаўных закупак хлеба ў Дубровенскім раёне.

У пратаколах агульнага сходу калгаса «Чырвоныя горы», Мардашкавіцкага сельсовета, записана прадаць дзяржаве 5 тон хлеба і набыць неабходныя будматэрыялы і іншыя рэчы. З 5 тон хлеба прадана толькі 12 цэнтнераў. Калгаснікі патрабуюць ад праўлення калгаса хутчэй вывозіць гэты хлеб і атрымаць матэрыялы. Але старшыня калгаса Шараў свядома тармозіць выязку закупленага збожжа.

Тысае становішча і ў калгасе «Пабеда», гэтага-ж сельсовета. Нават пасля пастановы агульнага сходу старшыня калгаса Драгінёў катэгарычна адмаўляецца прадаць дзяржаве лішкі хлеба.

У калгасе «Белдрэс» старшыня Сержанаў (член партыі) заявіў:

— Ленін прап'ем овае лішкі, а дзяржаве не прададзім.

Ёсць выпадкі адкрытай кулацкай агітацыі супроць хлебазакупак. У калгасе імя Блюхера (Скатацкага сельсовет) былы старшыня гэтага калгаса Казлоў на агульным сходзе калгаснікаў заявіў: «Я лішкаў хлеба дзяржаве не прадам і вы, калгаснікі, не прадавайце».

Адпору гэты кулацкі агент не атрымаў. Да рэчы, у гэтым калгасе ні адзін калгаснік да гэтага часу не прадаў наводнага кіло хлеба.

Класавы вораг працуе, а райком, РВК, палітаддзел не звяртаюць на гэта абсалютна ніякай увагі, не даюць адпору кулацкім манеўрам, накіраваным на зрыў дзяржаўных закупак хлеба.

МАЎЧАНСКІ.

РАЁНЫ, СКОНЧЫЎШЫЯ ХЛЕБАЗАКУПКІ

АРШАНСКІ
МЕНСКІ
СТАРОБІНСКІ

ПЕРАДАЗІКІ

Сіроцінскі раён
Прапойскі
Бягомльскі
Дзяржынскі
Ельскі
Нараўлянскі
Чарыкаўскі
Віцебскі

ГАНЕБНА ЗРЫВАЮЦЬ ХЛЕБАЗАКУПКІ

Пухавіцкі, Чэрвеньскі, Дубровенскі, Лоеўскі, Петрыкоўскі, Лельчыцкі, Чачарскі раёны.

2 КАЛГАСЫ АТРЫМАЛІ АУТАМАШЫНЫ

СЛУЦАК, 22. (Ад карэсп. «Звязды»).

Калгасы «Гігант», Грэскага сельсовета, і «Шлях калектывізацыі» Івана-Агародніцкага сельсовета за паспяховую работу атрымалі аўтамашыны.

Дзень прыбыцця машын ператварыўся ў калгаснае свята. Машыну сустракала калона калгаснікаў са сваім духавым аркестрам з 10 чалавек.

В. АНЭТ.

У ШКЛОЎСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ НЯМА ЖАЛЕЗНАЙ БОЛЬШЭВІЦКАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Змяшчаючы карэспандэнцыю тав. Розенблюма, рэдакцыя лічыць, што Шклоўскі РК павінен: 1) прыняць больш рашучыя меры да хутчэйшага правядзення ў жыццё рашэння Бюро ЦК, 2) адначасова стражэйшым чынам караць усіх тых, хто падрывае дысцыпліну ў партарганізацыі.

ШКЛОЎ, 23. (Па тэлефону ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»)

Адміністраванне і камандаванне замест узмоцненай партыйна-масавай работы ў большэвіцкіх метадаў выхавання членаў і кандыдатаў партыі — вось што характарызавала побач з іншымі памылкамі, становішча ўнутрыпартыйнай работы Шклоўскай партарганізацыі. Гэта было адзначана ў пастанове Бюро ЦК КП(б)Б «Аб пастаноўцы партыйна-масавай работы ў шклоўскай і пухавіцкай партарганізацыях».

Прайшоў месяц з дня апублікавання гэтай пастановы. Гэты месяц павінен быў з'явіцца месяцам сур'ёзнага ўздыму партыйна-выхаваўчай работы ва ўсіх галінах, у прыватнасці выхавання ў кожнага члена і кандыдата партыі пачуцця асабістай адказнасці за выкананне палітычных і гаспадарчых заданняў, ускладаемых партыяй на раённую партарганізацыю. «Райкомы ўсёй сумай сваіх арганізацыйных і масава-палітычных мерапрыемстваў, — гаворыцца ў пастанове ЦК, — павінны дабіцца такога становішча, каб кожны комуніст сапраўды быў важаком мас і з'яўляўся прыкладам у грамадскім і асабістым жыцці».

Аднак, райкомы і палітаддзелы МТС прайшоўшы месяц «ухлопалі» толькі на раскачку. Кустарныя сходы партыйцаў, на якіх абмяркоўвалася пастанова ЦК і мерапрыемствы па паляпшэнню партыйна-масавай работы, былі скліканы толькі 20 лістапада. Калі раней усе «метады» партыйнай узцейнасці зводзіліся райкомам да вынясення пінатлікіх спагнанняў, — што было моцна раскрытыкавана ў пастанове ЦК, — дык зараз райком аслабіў свой нагляд за захаваннем у арганізацыі большэвіцкай дысцыпліны. Гэта не замарудзілі выкарыстаць расхлябаныя элементы ў партарганізацыі.

І вось комуніст Крупадзёраў, агранам Фашчэўскай МТС, кідае самавольна адказны пост ушаўнаважанага выбарчай камісіі па Кяжыцкаму сельсовету і ўходзіць у адпачынак. Дырэктар-жа МТС тав. Пасвінчук захоўвае таксама афіцыйны нейтралітэт. Раз загад аб прадастаўленні Крупадзёраву адпачынку быў падпісан яшчэ месяц назад, — ён адпускае Крупадзёрава ў адпачынак, добра ведаючы, што той дэзертыраваў з сельсовета.

Загадчык райкомгаса тав. Сымонка з'яўляецца ўпаўнаважаным па Слижэўскаму сельсовету. Сельсовет адзначна адстае па выкананню плана ільнозагатовак і па закупцы хлеба. Аднак, Сымонка не адчувае сваёй адказнасці перад партыяй за становішча сельсовета. Ён карыстаецца тым, што ўсе комуністы пашлі ў Фашчэўку на куставы сход, і ўязджае ў Пікалоў, а адтуль у Магілеў. Толькі выпадкова раённыя арганізацыі даведваюцца, што адзін з адказнейшых участкаў аказаўся аголеным.

Старшыня Еганаўскага сельсовета, занесенага на чорную дошку, партыец Пашкоўскі раптам знікае з тэрыторыі совета і з'яўляецца на работу толькі праз тры дні. Тры дні ўсё збіраўся выехаць у Заходскі сельсовет для выканання даручэння райкома намеснік рэдактара раённай газеты тав. Міравой.

Так з дня ў дзень павялічваліся факты самага грубага парушэння партыйнай дысцыпліны, і толькі калі становішча стала абсалютна непрыгожым, райком нарэшце звярнуў на яго ўвагу і прысвяціў спецыяльнае пасяджэнне бюро пытанням узмацнення дысцыпліны.

Л. РОЗЕНБЛЮМ.

Усебеларускі паход за асваенне мастацкай літаратуры

КАЛГАСНІКІ З ВЯЛІКАЙ АХВОТАЙ НАВЕДВАЮЦЬ ГУРТКІ

КРЫЧАЎ. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Так калісці збіраліся ў доўгія асенніх і зімовыя вечары слухаць казкі пра зьвыш-чалавека асілка, пра казачнае царства, дзе людзі жывуць у дастатку. Людзі, слухаючы казкі, на якую-небудзь гадзіну забываліся на сваё поўталоднае жыццё. Жылі марамі... Даўно гэта было.

Але наступілі новыя часы. У калгасную вёску прыйшло заможнае жыццё. Не цікавяць калгасніка цяпер тыя казкі. Ды і к чаму яны, калі можна прысмачней скарыстаць свой вольны час. Так і зрабілі ў калгасе імя Сталіна, Сакольніцкага сельсовета, дзе калгаснікі 21 лістапада сабраліся паслухаць не казку, а мастацкі твор беларускай літаратуры—«Дрыгву» Якуба Коласа.

Сабраліся і ў калгасе «Заветы Ільіча» і ў іншых калгасах сельсовета. Гэта першыя калгасы раёна, якія прыступілі да асваення мастацкай літаратуры. Твор вельмі зацікавіў калгаснікаў. Пасля трох гадзін чыткі можна было чуць рэплікі:

— Чытай далей, чым-жа яно скончыцца.

Усю арганізацыйную работу па правядзенню гэтай вялікай справы па асваенню калгаснікамі і рабочымі цементнага завода мастацкай літаратуры райком партыі і палітаддзел МТС даручылі спецыяльна арганізаванаму штабу. Для работы гурткоў па чытцы літаратуры вызначана 5 дзён у месяц. Наведванне гурткоў па асваенню мастацкай літаратуры для комуністаў і комсамольцаў абавязкова. Да чытак прыцягнуты настаўнікі-літаратуразнаўцы. У кожным сельсавеце вылучан адзін настаўнік адказны, які інструктуе остатніх. Да красавіка 1935 г. пастаўлена як мінімум прапрацаваць такія мастацкія творы «Маці» Максіма Горкага, «Падняятая цаліна» Шолахава, «Железный поток» Серафімовіча, «Дрыгва» Якуба Коласа, «Опалох на загонах» Галавача, «Під ракой Арэсай» Яніны Купала, «Цені на сонцы» Александровіча, «Нянавісць» Шухава.

ВІШНЕЎСКІ

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

ДЫРЭКТАРУ БЕЛДЗЯРЖТРАНСА тав. ХМЕЛЮ

ЦІ-Ж ГЭТА НЕ ЗДЗЕКІ?

(ПІСЬМО ПАСАЖЫРАЎ).

4 лістапада ў 2 гадзіны дня мы прыбылі на аўтабусную станцыю (Менск) для пакупкі білетаў на Астрашыцкі Гарадок. Продаж білетаў пачаўся роўна ў тры з паловай гадзіны дня. Аўтабус павінен быў адпраўляцца а палове шостай гадзіны.

Усе чакалі. Паступала дзевятая гадзіна. Нарэшце, з'явіўся прадстаўнік Белдзяртранса і аб'явіў, што машына на Астрашыцкі Гарадок не пойдзе, бо шофер не з'явіўся на работу. І толькі пасля настойвання пасажыраў у пачатку 10-й гадзіны машыну прыслалі.

Большасць пасажыраў — камандзіраванныя, а таксама жанчыны з малымі дзецьмі — цэлы дзень прастаялі на холадзе, чакаючы аўтабуса.

Такія адносіны да пасажыраў мы лічым зусім недапушчальнымі.

АКСЕЛЬРОД А., МАЛІШЭЎСКІ Л., БРОЗІ, ШЫБУЛЬКІН, МАРГОЛІНА, ДРАЗДОВІЧ (усяго 19 подпісаў).

САКРАТАРУ КАСЦЮКОВІЦКАГА РК КП(б)Б т. ЛІСКОВІЧУ.

ЗА 15 ДНЁЎ АТРЫМАЛІ ДВА НУМАРЫ ГАЗЕТ

(ПІСЬМО КОМСАМОЛЬЦА).

У саўгасе «Селецкі» (Касцюковіцкі раён) каля 60 рабочых на лістапад падпісаліся на газеты. Але-ж з дастаўкай газет справа абстаіць з рук вон дрэнна.

Так, з 1 лістапада па 14-е падпісчыкі атрымалі толькі па два нумары газет «Праўды», «Звязды», «Комсомольской правды» і інш.

На запытанне пашыснікаў, чаму не дастаўляюцца газеты, паштовы агент Даніленка адказвае: — «Мне не дасылаюць з Касцюковіч».

Такія выпадкі ў Касцюковічах не адзінкавыя.

АНТАНЕНКА.

УПАЎНАВАЖАНАМУ НАРКОМСУВЯЗІ тав. БАЛОДЗЬКА

ЗРЫВАЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА ВУЧЭБНАГА КАМБІНАТА СУВЯЗІ

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

На пабудове вучэбнага камбіната сувязі працуе 85 рабочых-будаўнікоў. Сярод іх ніякай палітычна-выхаваўчай і культурна-масавай работы не праводзіцца. Рабочыя газетамі не забяспечваюцца. Соцспаборніцтва і ўдарніцтва на пабудове не разгорнута.

Нямa планавасці ў самой рабоце. Начальнік пабудовы Пачокін і прараб Дзержанаў не маюць каляндарнага плана работ. Нарады рабочым не выдаюцца.

Будаўніцтва затрымліваецца з-за недахвату будаўнічага матэрыялу (штукатурных цвікоў, цаменту, жалезных балак і інш.)

Рабочыя па 2 месяцы не атрымліваюць зарплаты, у сувязі з чым ёсць вялікая цякучасць рабочай сілы. 1 верасня 1934 г. было рабочых 120 чалавек, а па 1 лістапада засталося толькі 80.

Аддзел комунальнага будаўніцтва Упаўнаркомсувязі, не прымае належных мер для фарсавання работ па своечасовому закончэнню будаўніцтва.

ШАРАЎ.

ДЫРЭКТАРУ БЕЛХАРЧГАНДЛЯ тав. СЯМЕНАВУ

ПЕЛЕПШЫЦЬ УМОВЫ КУРСАНТАЎ

(ПІСЬМО КУРСАНТАЎ)

Вучэбнае памяшканне Менскай школы Белхарчгандля ў антысанітарным становішчы. У аўдыторыях смецце, падлога рэзка калі мыецца, усюды брудна. Такое, калі не горшае становішча, і ў інтэрнаце.

Абеды курсантам прывозяцца з сталовай Белгандля з вялікім спазненнем і заўсёды халодныя. Снеданні і вячэры выдаюцца з вялікімі перабоямі. Каб атрымаць абед прыходзіцца доўга стаяць у чарзе, бо ўсім не хапае лыжак (на 60 чалавек 4 лыжкі). Абеды раздаюць прыбіральшчыцы ў брудных спецоўцах.

Дырэкцыя школы аб палепшэнні бытавых умоў курсантаў не клапоціцца.

БАГДАНАЎ, ЯНКОЎСКІ.

Па слядах пісем

„ТАВАРЫШ БУРЫ АЕЯЦАЕ"

Пад такім загалоўкам 2 лістапада ў «Звяздзе» было змешчана пісьмо настаўніка Дзяружына.

Як паведамляе Чавускі РК КП(б)Б, факты поўнасцю пацвердзіліся. Прыняты ўсе меры для тэрміновага заканчэння новага будынку для школы. Райвыканком адпусціў 3000 рублёў. У бліжэйшыя дні школа будзе размешчана ў новым будынку.

„КОЛЬКІ ЯШЧЭ БУДЗЕ ТАКІХ "ЗАУТРА"

У «Звяздзе» 16 верасня было змешчана пісьмо загадчыка НСШ Доршака.

Цухавіцкі РК КП(б)Б паведамляе, што факты, паказаныя ў пісьме, поўнасцю пацвердзіліся. Зараз тав. Доршаку аблігацыі выданы на рукі.

За валяжыту і бяздушныя адносіны загадчыка раёнашчадкасы Краўченка прыцягнут да партыйнай адказнасці.

„КРУКАЎ РАЗБАЗАРВАЕ ДЗЯРЖАЎНУЮ МАЕМАСЦЬ"

На змешчанае ў «Звяздзе» ад 7 ліпеня пісьмо «Крукаў разбазарвае дзяржаўную маемасць» Рэчыцкі РК КП(б)Б паведамляе, што факты поўнасцю пацвердзіліся.

Крукаў з работы загадчыка МТС знят і выключан з партыі.

У Пагосцкай пяцігадовай сярэдняй школе, Старобінскага раёна, доўгі час зрываліся заняткі з прычыны адсутнасці газы. Зараз сельсавет выдала дровы школе, на палову змешаную з вадой. Школа апоў-часа класы без святла.

НАСТАЎНІК.

„ГАРУЧАЕ" ПРЫБЫЛА

ЧАМУ АСОВІЦКІ СЕЛЬСОВЕТ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АДСТАЛЫМ У ЧОРНАДОШАЧНАЙ ПЕТРЫКАЎШЧЫНЕ?

(АД ПАЛЕСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА «ЗВЯЗДЫ»)

Асовіцкі сельсовет па свайму эканамічнаму становішчу — адзін з моцных у Петрыкаўскім раёне. Ураджай азімых і яравых у гэтым годзе параўнаўча з мінулым у два разы лепшы. Аднак ні па адзаму віду дзяржаўных паставак, а таксама па фінпляну сельсовет не з'яўляецца перадавым. Наадварот, па ўсіх паказальніках ганебна цягнецца ў хвасце. Нават дзяржаўны план хлебапаставак выканан толькі на 90 проц.

Дзе карэнні такога становішча? Іх патрэбна шукаць у самім кіраўніцтве. Узначальвае сельсовет «комуніст» Пракапенка, які мае каля дзесяці партсцягнанняў. Раней Пракапенка працаваў у радзе іншых сельсоветаў раёна і нідзе сябе не апраўдаў. Тут-жа ён не толькі не апраўдвае сябе, а свядома праводзіць правую практыку ў рабоце сельсовета. У гэтым яму дапамагае сакратар сельсовета Герасімовіч.

Пры ўліку аб'ектаў абкладання яны свядома недалічвалі некаторым заможна-серадняцкім гаспадаркам зямлю, нежамляробчыя заработкі, кан'юнктурныя даходы. Член сельсовета вёскі Асовец Дубель Павел мае каня дзве каровы, некалькі свіней, авечак і 4 га зямлі. Ці можна дапусціць, што пры 3-х едаках гэта гаспадарка не прадавала на рынку сельска-гаспадарчых прадуктаў? Ні ў якім разе. Аднак, сельсовет кан'юнктурных даходаў не ўлічыў ён ці аднаго рубля. І таму ніводна дзіўнага калі Дубель Павел плоціць сельгаспадатку ўсяго 24 руб.

Гаспадарны Анікейчыка Якава сельсовет не толькі не ўлічыў кан'юнктурных даходаў, але палітыку сельгаспадатак, як з калгасніка, хоць Анікейчык ніколі калгаснікам не быў. Такіх фактаў на вёсках сельсовета ёсць нельмі многа.

Больш 80 проц. гаспадарак сельсовета складаюць аднаасобнікі. Сярод іх шмат кулакоў. Абкладзены-ж індывідуальным падаткам толькі тры гаспадаркі.

— Нельга-ж усіх кулакоў вынівіць і абкласці індывідуальна адразу, — кажа Пракапенка.

Справа дайшла да таго, што каля 50 заможных гаспадарак не выканалі поўнасцю хлебапастаўкі, не здалі ні аднаго кілограма бульбы, мяса, ні аднаго [illegible] малака, ні аднаго рубля [illegible] падатку. Замест прыняцця спісных сабатажнікаў да адказнасці кіраўнікі сельсовета патураюць ім.

Сакратар сельсовета Герасімовіч амаль кожны дзень п'янствуе з кулакамі і заможнікамі. Больш таго, лічыцца фармальна калгаснікам, Герасімовіч тайком карыстаецца зямлёй амаль у кожнай вёсцы сельсовета.

Зрослася з кулакамі і заможнікамі, «кіраўнікі» сельсовета адгарадзіліся сцяной ад актыва і ўсю сваю работу праводзяць канцылярска-бюракратычным метадам.

Старшыня цэнтральнага калгаса «Зорка» тав. Грынкевіч, маючы асабістыя рахункі з старшынёй сельсовета Пракапенкам, працінаставіў сябе сельсовету, хоць фармальна і лічыцца намеснікам старшыні. Для Грынкевіча распаладжэнні і ўказанні сельсовета не існуюць. Захацелася яму не закантрактаваць садавіну і гародніну, так і зрабіў, а потым прадаў на прыватным рынку. Значная частка калгаснікаў калгаса «Зорка» маюць вялікую колькасць (ад 1 да 2-х гектараў) палявой зямлі, не лічачы сядзібнай. Апрацоўваюць калгаснікі гэту зямлю не самі, а здаюць на часць свалкам-аднаасобнікам.

Пракапенка і Грынкевіч — абодны парторгі, адзін сельсовета, другі калгаса, але партмасавай работы ні адзін не праводзіць. Сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў пастановы партыі і ўрада не распрацоўваюцца. Здаровая крытыка і самакрытыка не разгорнута. Насценная газета ні ў калгасе, ні ў сельсавеце не выпускаецца. Быў выпадак, калі Грынкевіч двух маладых селькораў Юніцкага і Вінакура прагнаў з калгаснага двара, заявіўшы: «Вам тут, малакасосам, няма чаго рабіць».

Не атрымаўшы правільнага напрамку ў рабоце, маладыя селькоры сталі на няправільны шлях — склочніцтва.

Склоку паміж маладымі селькорамі і Грынкевічам узначаліў дырэктар ПІКМ Курда.

Ці ведае аб гэтым раённае кіраўніцтва? Ведае, але глядзіць на гэту склоку сроль пальцы. Інструктар райкома Шынкевіч у Асовіцкім сельсавеце і калгасе «Зорка» бывае вельмі часта, бачыць, што партмасавая работа не праводзіцца і ніякіх мер не прымае. Ён на сустрэчі ператварыўся ў райуначаўжанага, а пра свае непасрэдныя абавязкі— арганізацыю партмасавай работы — забыў.

Р. ФРАЛОЎ.

САКРАТАРУ МЕНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б тав. РЫСКІНУ

СТВАРЫЦЬ СОВЕЦКАМУ СТУДЭНЦТВУ УМОВЫ ДЛЯ ПАСПЯХОВАЙ ВУЧОБЫ

(АГЛЯД ПІСЕМ)

Для стварэння свайго камандзнага складу мы арганізавалі вялізарную сетку навучальных устаноў. Універсітэты, інстытуты, тэхнікумы па ўсіх галінах гаспадаркі, навукі, тэхнікі і мастацтва пакрылі нашу краіну. На ўсё гэта дзяржава траціць сотні мільёнаў і мільярды рублёў. І калі тым не менш у радзе навучальных устаноў яшчэ не створаны нармальныя умовы для паспяховай вучобы студэнтаў, дык прычыны гэтага ў тым, што справа знаходзіцца ў руках чыноўнікаў і бюракратаў.

Вось што ў пісьме ў рэдакцыю піша студкор з Менскага медінстытута:

«У інтэрнатах няма ўмывальнікаў, брудна. Камендант з кулакамі кідаецца на студэнтаў. Раней аўдыторыі выглядаюць як пасля пагрому: перакуленыя краслы, пабітыя пробіркі, на падлозе вада. Адначынак студэнтаў не арганізаван. Мастацкую літаратуру, няма дзе дастаць».

Загадчыкам гаспадаркі тэхнікума народна-гаспадарчага ўліку ў Менску працуе нейкі Шкурынскі. Перш чым забяспечыць студэнтаў пасцельнай бялізнай, ручнікамі, матрацамі, ён закупіў шафы, каб класы ў іх бялізну. Зараз у тэхнікуме столькі шаф, што за імі не прайсці, а бялізны няма. Група студэнтаў тэхнікума піша нам:

«Ложкаў у нас хапала. Але каб пастаўіць шафы, нас цяпер згрузілі па 2 чал. на ложак. А ў выніку — бруд, антысанітарыя. Хадзілі студэнты скардзіцца да Шкурынскага, дык той іх выгнаў з кабінета. Леташнія простыні — кажа ён — парваны на трапкі. А новых яшчэ на куплаў».

Ёсць у тэхнікуме дырэктар, партком, прафком. Ёсць, урэшце, Цэнтральнае кіраўніцтва народна-гаспадарчага ўліку, якому гэты тэхнікум падпарадкаваны. Але ніхто не патурбаваўся паглядзець, як студэнты вучацца, як ідзе вучоба.

Пры БДУ сёлета адкрыўся гістарычны факультэт, мэтай якога з'яўляецца падрыхтаваць высокакваліфікаваных работнікаў у галіне гісторыі як для навуковай работы, так і для выкладчыцкай. На факультэт прынята 67 студэнтаў, з іх значная частка (35 проц.) — былыя дырэктары і выкладчыкі сярэдніх школ. Як-жа забяспечана вучоба?

Партарг гістарычнага факультэта тав. Г. Махапёнак і Л. Камінскі (прафком) нам пішуць:

«Па гісторыі старажытнага ўсходу і гісторыі сярэдніх вякоў падручнікаў няма. Таксама няма ніводнага падручніка па паўнічнай мове. Універсітэт не паклапаціўся закупіць для нас гістарычныя карты. У выніку акадэмік Н. НІКОЛЬКІ чытае лекцыі гісторыі без карт.

Частка нашых студэнтаў жыве ў бараку № 52. Але ён так працякае, што ў дажджлівыя дні там спаць нельга. За абедам стаім 2-3 гадзіны ў чарзе. Склаліся такія ўмовы, што частка студэнтаў пачынае панідаць факультэт і пераходзіць у іншыя інстытуты, дзе створаны лепшыя ўмовы».

Гістарычны факультэт, як вядома, быў створаны пасля спецыяльнай пастановы ЦК ВКП(б) аб выкладанні ў школах гісторыі. Гэтаму факультэту партыя аддае асаблівую ўвагу. Тым мацней трэба ўдарыць па тых чыноўніках і бюракратах, якія зрываюць нармальную вучобу ў гэтай важнейшага значэння навучальнай установе.

У абсалютна ненармальных умовах працуе менскі дашкольны тэхнікум. Сёлета тэхнікум атрымаў уласнае памяшканне на 6. выстаўцы, а сталовая засталася ў горадзе, пры Белпедтэхнікуме. Каб ехаць у горад спедаць, абедаць і вячэраць, апрача часу, прыходзіцца ступ втам траціць грошы на трамвай. Але дырэкцыя тэхнікума в забяспечыла студэнтаў ільготным білетамі. Студэнтка III курса тэхнікума т. Дыбоўская нам піша:

«Студэнты часта сядзяць у цемнаце, бо электрычнасць у інтэрнат яшчэ не правялі, а газы камендант не купляе. Бялізну прыходзіцца мыць на дварэ халоднай вадой пэд кранам. Нармальнага распаду заняткаў няма і вельмі часта студэнты знаходзяцца ў аўдыторыі, чакаючы лекцыі з 9 гадзін раніцы да 9 вечара».

З таго-ж тэхнікума тав. В. А. скардзіцца на поўную адсутнасць масава-культурнай работы са студэнтамі. За ўвесь час заняткаў не было ніводнага паходу студэнтаў у кіно, тэатр. Насценгазеты няма.

Не лепш справы ў гэтым сэнсе ў музычным тэхнікуме (Менск). Да навучальнага года дырэкцыя тэхнікума амаль што зусім не рыхтавалася. Замест 1 верасня заняткі пачаліся 13-га, і то на працягу ўсяго месяца ў дзень бывала па 2 лекцыі. Астатні час студэнты шыбталі з аўдыторыі ў аўдыторыю, не ведаючы куды, прытыкнуцца. Зараз гэта лічыцца, што заняткі адбываюцца ў тэхнікуме нармальна. Але ў якіх умовах жывуць і працуюць студэнты?

Студэнты тэхнікума нам паведамляюць.

«Крэслаў у аўдыторыях няма. Калі прыходзіш на заняткі, цягні крэсла адкуль хочаш, інакш будзеш стаяць. Дошкі нікуды не варты. Скардзіліся мы дырэктару і прафкома, што ў класах цёмна, няма святла. Нам адказалі: у вас вочы маладыя, убачыце. Так і прыходзіцца нам спяціць вочы».

Мы ў гэтым агляде не закранаем пытання жыллёвых умоў студэнтаў. Тут таксама няма агіднасцей, якія пры больш чулых адносінах боку дырэкцыі, можна было-б знішчыць і значна палепшыць умовы жыцця студэнтаў. Чаго, напрыклад, варт такі факт, які нам паведамляе тав. М. Загорскі — студэнт клінічнага факультэта, Менскага інстытута народнай гаспадаркі.

«Значная частка студэнтаў не забяспечана інтэрнатамі. Каб дастаць прыватную кватэру, трэба плаціць 20-30 руб. у месяц, у той час, як дэканат дае толькі 10 руб., і то не ўсім. У выніку студэнт САМСОНАЎ вымушан спаць у будцы вартаўніка студэнцкага гарадка. На ўсе нашы скаргі дэкан факультэта ЭЛЬЯНАЎ звычайна адказвае: — «Праз дзень-два атрымаеце». Праходзіць і гэты тэрмін. Тады Эльяноў абяцае пагаварыць з ГУРЫНЫМ — намеснікам дырэктара інстытута. Так ужо трэці месяц усе вырашэнне пытанне з нашым інтэрнатам. Студэнты прастуджваюцца, хварэюць».

Факты, тут прыведзеныя з'яўляюцца даволі сур'ёзным сігналам. Пастанова ЦК ВКП(б) аб выкрытых ім фактах злачынага ігнаравання культурна-бытавых запросаў студэнтаў у Нова-Чаркаскім інстытуце павінна была з'явіцца сур'ёзным папярэджаннем для ўсіх нашых навучальных устаноў і партарганізацый. У гэтай пастанове ЦК ВКП(б) так і адзначаў, што хваравітыя з'явы, выкрытыя ў Нова-Чаркаскім інстытуце, характэрны для цэлага раду навучальных устаноў. Тым не менш, кіраўніцы нашых менскіх вузаў не ўлічылі папярэджання ЦК ВКП(б). Нічога не зрабіў і Наркомасветы. Наркомшляхцяпром і іншыя наркаматы ў сваіх навучальных установах.

Трэба, каб за справу сацыяльна-бытавога становішча студэнтаў нашых вузаў і тэхнікумаў узяўся Менскі гарком партыі, каб ён з ураслівай яму большэвіцкай рашучасцю закінуў да парадку тых, хто ігнаруе совецкае студэнцтва. У нашай сталіцы ўмовы для жыцця і працы студэнтаў павінны быць створаны такія, аб якіх і мараць не можа студэнт капіталістычнай краіны.

Р. ФРАЛОЎ.

За рубяжом

КІТАЙСКАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ПРАСОЎВАЕЦЦА НА ЗАХАД

ЛОНДАН, 24 лістапада. (БЕЛТА). Гангконгскі карэспандэнт «Тайнса» паведамляе, што кітайская Чырвоная армія, якая прасоўваецца на Захад, дасягнула Чуанчкоу (у правінцыі Гуансі) і Юньпін (у правінцыі Хунань).

Чырвоныя часці ўтрымліваюць моцную базу ў Хуачане (у правінцыі Цзянсі, каля правінцыі Фуцзянь). Хуачан асаджан панскімі войскамі. Па словах бейпінскага карэспандэнта «Тайнс», замежным місіянерам прапанавана эвакуавацца з паўднёвай часткі Хунані ў сувязі з набліжэннем чырвоных войск, прынімых з паўночнай часткі Гуйджоу. Чырвоныя войскі пад камандаваннем Холуна занялі Тальпінчэ і направяцца Юньпіну (у Хунані).

Далей карэспандэнт указвае, што згодна паведамлення кітайскіх газет кантонскі ўрад заключае пазыку ў размеры 10 млн. даляраў для вядзення вайны супроць Чырвонай арміі ў замежных нафтавых кампаніях. У якасці забеспячэння пазыкі ўрад прапануе кантонскую электрастанцыю. Разам з гэтым прымусовая пазыка ў размеры месячнай рэнты, атрымліваемая ў кантонскіх памешчыкаў, таксама прызначаецца на ваенныя расходы і будзе выкарыстана на куплю самалётаў.

ПАРАГВАЙСКІЯ ВОЙСКІ ПРАДАЎЖАЮЦЬ НАСТУПЛЕННЕ

НЬЮ-ЮРК, 24 лістапада. (БЕЛТА). Як паведамляе «Нью-Іорк таймс», парагвайскія войскі, прадаўжаючы наступленне, захапілі пункты Гуачалья і Беатрыс і набліжаюцца к галоўнай штабкватэры балівійскіх войск, якая знаходзіцца ў Вілья Монтас. У Балівіі ў сувязі з гэтым абвешчана мабілізацыя ўсіх дасягнуўшых 18-гадовага ўзросту.

РЭПРЭСІІ СУПРОЦЬ АСТУРЫЙСКІХ ГАРНЯКОЎ

ПАРЫЖ, 24 лістапада. (БЕЛТА). Згодна паведамлення мадрыдскай «Лібертад» уласнікі астурыйскіх рудникоў заявілі ўраду, што ніводзін гарняк не будзе дапушчан на работу, пакуль усе рабочыя не здадуць схаваную зброю. Прамысловцы ўзнялі хадайніцтва аб тым, каб у Мієрэсе і Ланрэсы, у якіх паўстанне гарнякоў насіла асабліва жорсткі характар, пастаянна знаходзіўся атрад жандармерыі ў 600 чалавек. Урад адаволіў хадайніцтва. Выраішана асігнаваць спецыяльныя сумы для кампенсацыі прадпрыемцаў, панёсшых убыткі ў сувязі з паўстаннем. Іспанскія чыгуначныя кампаніі, як відаць з пісьма сакратара прафсаюза чыгуначнікаў, надрукаванага ў «Эральдо дэ Мадрыд», знялі зарплату ўсім рабочым і служачым, якія вярнуліся на работу пасля ўсеагульнай стачкі.

ПАЛОВУ БЮДЖЭТА НА ПАДРЫХТОЎКУ ВАЙНЫ

ТОКІО, 24 лістапада. (БЕЛТА). Совет міністраў канчаткова зацвердзіў бюджэт на 1935-36 год у суме 2.210 млн. іен. Бюджэтны дэфіцыт у размеры 759 млн. іен пакрываецца выпускам новых пазык. Бюджэт ваеннага міністэрства складае 490 млн. іен і морскага міністэрства — 530 млн. іен. Агенцтва «Сімбун рэнга» падкрэслівае, што бюджэт 1935-1936 года самы вялікі ў гісторыі Японіі.

НАПАД ФАШЫСЦКІХ ГРАМІЛ НА ДРУКАРНЮ КОМУНІСТЫЧНАЙ ГАЗЕТЫ

ЛОНДАН, 24 лістапада. (БЕЛТА). Група фашыстаў уварвалася ў друкарню комуністычнай газеты «Дэйлі уоркер». Фашысты сталі збіваць 67-гадовага старога і хлопчыка пасыльнага, якія знаходзіліся ў памяшканні. Паліцыя да гэтага часу не ўстанавіла асоб фашыстаў, не гледзячы на тое, што ёй быў паведамлен нумар таксаматора, чакаўшага фашысцкіх грамід, пакуль яны арудавалі ў друкарні газет.

У ЛІГЕ НАЦЫЙ

Прыняты даклад камітэта па ўрэгуляванню балівійска-парагвайскага канфлікта

ЖЭНЕВА, 24 лістапада. (БЕЛТА). Учора адбылося апошняе пасяджэнне камітэта па ўрэгуляванню балівійска-парагвайскага канфлікта ў Чако. Камітэт заслухаў і прыняў папраўкі і дадаткі да свайго першапачатковага даклада, выпрацаванага спецыяльнай падкамісіяй з улікам папярэдніх спрэчак і пажаданняў бакоў.

Асноўныя змены зводзяцца к наступнаму: 1) кантрольная камісія (у складзе Перу, Чылі, Аргентыны, Уругвая будуць запрошаны таксама Бразілія і Злучаныя Штаты) выедзе на месца і прыступіць к рабоце неадкладна пасля таго як будзе сфармавана; 2) бакі пайтны паступова дэмабілізаваць свае арміі і прапарцыянальна скарацінь узбраенні; 3) рэкамендаваная спачатку дакладам нейтральная зона па абодва бакі фронта не фіксуецца. Бакі абавязваюцца толькі не весці ніякіх работ ваеннага характару ў 150-кілометравай зоне па абодва бакі фронта. Нагляд за парадкам у гэтай зоне ўскладаецца на паліцыю абодвух бакоў.

Совецкі дэлегат тав. Гіршфельд настойваў на захаванні 50-кілометравай нейтральнай зоны. Камітэт прыняў па гэтаму пытанню кампрамісное рашэнне, прадаставіўшы кантрольнай камісіі вызначаць у кожным выпадку глыбіню нейтральнай зоны. Тав. Гіршфельд указаў таксама, што прыцягненне палны к нагляду за парадкам нясе небяспекі новых канфліктаў. Вось чаму совецкі дэлегат лічыць больш мэтазгодным ускласці гэту функцыю на кантрольную камісію, якая, згодна дакладу, павінна мець у сваім распараджэнні неабходныя сілы і сродкі. Адабраючы пункт аб паступовай дэмабілізацыі, тав. Гіршфельд прапанаваў даповніць яго дакладнымі ўказаннямі тэрмінаў дэмабілізацыі і размераў дэмабілізуемых кантынгентаў.

Сёння асамблея Лігі нацый 46 галасамі (Балівія і Парагвай устрымаліся) прыняла амаль без спрэчак даклад камітэта разам з папраўкамі. Адзін з двух аратараў, выступіўшых у спрэчках — французскі дэлегат Масілы — заявіў, што мардуднасць, з якой дзейнічала Ліга пры выраішэнні канфлікта, можа быць вытлумачана толькі выключнымі акалічнасцямі. Аднак, ёй прыдзецца падумаць аб больш хуткай працэдуры ў іншых выпадках, калі справа зноў будзе ісці аб захаванні або аднаўленні міру.

Забастоўка ў Нью-Іоркскім выдавецтве «Маколей».

НА ЗДЫМКУ: Вядомы амерыканскі пісьменнік, адзін з рэдактароў журнала «Нью-Масэсэз», Майкл Голд (злева) прымае ўдзел у стачачным пікеце супрацоўнікаў выдавецтва «Маколей».

САПРАЎДНАЯ МЭТА СУСТРЭЧЫ МУСАЛІНІ З ШУШНІГАМ

ЛОНДАН, 24 лістапада. (БЕЛТА). Як паведамляе «Дэйлі геральд», сапраўдная мэтай сустрэчы Мусаліні з Шушнігам было пытанне аб заключэнні ваеннага дагавору. Пытанне было выражана ў вербальнай форме з баранні нацыянал-соцыялістскіх шпіёнаў, якія усё яшчэ займаюць адказныя пасты ў аўстрыйскім міністэрстве замежных спраў. Аўстрыйскі ваенны дагавор прадугледжвае чатыры магчымых становішчы: нападзенне Германіі на Аўстрыю, нацыянал-соцыялістскі пераварот, вайна, у часе якой Чэхаславакія і Югаславія могуць напрабаваць прайсці праз тэрыторыю Аўстрыі, і паўстанне аўстрыйскіх рабочых. У любым з гэтых выпадкаў італьянскія войскі павінны будуць уступіць на аўстрыйскую тэрыторыю і ўзяць на сябе абарону частка краіны, тым часам як аўстрыйскія рэгулярныя войскі і хейм вер будуць дзейнічаць па астатняй тэрыторыі.

АБ СКЛАДЗЕ ПРЭЗІДЫУМАЎ ГАРАДСКІХ СОВЕТАЎ

Пастанова прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР

Прэзідыум ЦВК БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць склад прэзідыумаў Менскага, Віцебскага і Гомельскага горсаветаў у колькасці 17 членаў і 5 кандыдатаў да іх і склад іншых горсаветаў у колькасці 11 членаў і 4 кандыдатаў.

2. У сувязі з гэтым арт. 15 «Палажэння аб гарадскіх саветах» (З. З. БССР за 1928 г. № 38, арт. 362) запісаць у наступнай рэдакцыі:

115. Гарадскія саветы гарадоў, непасрэдна падпарадкаваных Прэзідыуму ЦВК БССР, выбіраюць з свайго складу прэзідыум у колькасці 17 членаў і 5 кандыдатаў да іх; іншыя гарадскія саветы выбіраюць прэзідыум у колькасці 11 членаў і 4 кандыдатаў да іх».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

22 лістапада 1934 г
г. Менск.

АБ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ У АРГАНІЗАЦЫІ ПРАГЛЯДУ ФІЛЬМА „ЧАПАЕВ"

ПАСТАНОВА БЮРО МЕНГАРКОМА КП(б)Б.

Выходзячы з таго, што фільм «Чапаев» мае велізарнае значэнне як узорны мастацкі твор, пераканаўча, красамоўна дэманструючы арганізуючую ролю нашай партыі, героіку грамадзянскай вайны, з'яўляючыся магутным сродкам класавага выхавання шырокіх мас працоўных, менскі гаркам КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць парткомам і ФЗМК разгарнуць шырокую масава-растлумачальную работу па папулярызацыі «Чапаева» пад лозунгам «Кожны рабочы і служачы павінен глядзець фільм «Чапаев».

Для гэтага:

а) 26 лістапада арганізаваць у кіно «Пролетарый» тры сеансы грамадскага прагляду фільма «Чапаев» з тым, каб скарысталі партыйны, профсаюзны і комсамольскі актыў для правядзення мітынгаў, гутарак, рэцэнзій і водгукаў у пляткарнях і насценгазетах.

б) П. пачаючы з 26 лістапада фільм «Чапаев» пусціць для масавага прагляду ў кіно «Пролетарый» для ўсіх калектываў рабочых, служачых, студэнтаў і чырвонаармейцаў з пазнейшай колькасцю сеансаў, арганізуючы калектыўныя паходы прадпрыемстваў, устаноў і ВНУ і абавязарнае фільма ва рабочых кварталах.

в) Лічыць неабходным арганізаваць не менш трох сеансаў для ўдарнікаў калгасаў і саўгасаў Менскага раёна і 1-й і 2-й МТС.

2. Побач з прагляданам фільма «Чапаев» арганізаваць азнаямленне прапоўных з чапаеўскай эпапеяй, арганізаваць выстаўкі, прысвечаныя Чапаеву і грамадзянскай вайне, выпусціць рэкамендацыйныя спісы літаратуры, арганізаваць групавую чытку кнігі Фурманава «Чапаев», скарыстаць матэрыял фільма на занятках школ партыйнай і комсамольскай сеткі парт-палітвучэння.

3. Забараніць знятае фільма «Чапаев» з экранаў менскіх кінатэатраў без санкцыі Аддзела культуры і прапаганды ленінізма гаркома КП(б)Б.

Нам. сакратара Менгаркома
КП(б)Б ХАДАСЕВІЧ.

Паведамленне Выязной Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б)

1 і 2 снежня б. г. у 10 г. раніцы ў гор. Менску (памяшканне ЦК КП(б)Б, пакой 32) выязной камісіяй КПК пры ЦК ВКП(б) будуць разглядацца апеляцыйныя партсправы наступных таварышоў:

1 снежня

Еўлакімаў І. М., Азаронак І. А., Гуровіч Н. Г., Кавалёў І. Ф., Качэрэін С. С., Пятроў П. Ф., Рэвуцкі К. А., Ратнер Б. І., Сабалеўскі В. В., Сымончык Ф. В., Шэўчанка П. В., Слепчын З. Ш., Падаліца З. М., Рабцэвіч Н. Е. — **Менск.**

Ласкацёнак А. Д., Браўдэ Г. А., Бярукоў С. Н., Буянаў Н. А., Гудоў Ф. Л., Ліпкін Я. В., Ліхаладай Г. В., Міхаменка Ф. Е., Тычынін Д. М., Эпелец П. Ш., Стыцько А. М., Хрушч А. Т. — **Віцебскі раён.**

Ашарчук С. М., Рыбінскі В. Ф., Туровіч К. К. — **Лепельчыцкі раён.**

Блінец М. Ф., Лазараў В. І. — **Рэчыцкі раён.**

Пагаранская Е. І., Гладкі А. А., Закразеў І. Г., Сундукоў М. С., Семянцоў В. І. — **Гомельскі раён.**

Сінаўскі І. І., Кржэсінскі І. І. — **Горацкі раён.**

Алейнікаў П. Н., Ігнацюк Л. І., — **Лёзненскі раён.**

Баляснікоў Н. І., Баркан С. Ш., Юневіч С. О. — **Барысаўскі раён.**

Булкіна М. Г., Ганзбург І. М., Кучынскі Ф. Я., Кароль Л. Н., Шышоў В. І., Элейцвейг А. Т. — **Бабруйскі раён.**

Алейскі С. А., Петрушенка І. Н., Шам П. А. — **Камарынскі раён.**

Александраў А. І., Скорабагаты І. П. — **Шклоўскі раён.**

Гузаў А. А., Новікаў Н. П., Сінельнікаў Ф. С. — **Буда-Кашалёўскі раён.**

Рабінок Д. В., Рагозенка П. Н. — **Ельскі раён.**

Гаўрылаў П. А., — **Касцюковіцкі раён.**

Вертліб М. Н., Казлоў Г. В. — **Крычаўскі раён.**

Васілеўская Н. Л., Клюева М. І., Тагановіч І. В., Юхвідзін І. А. — **Аршанскі раён.**

Вендраў Л. Н. — **Заслаўскі раён.**

Васільеў П. Ф., Донін І. І., Лёгенькі Г., Раскін Г. О., Севасцянчык Ф. Д., Кіркевіч А. К. — **Жлобінскі раён.**

2 снежня

Грэбеньчук В. І. — **Стародарожскі раён.**

Багданаў Н. А., Буракоў І. Ф., Патапаў Д. Ф. — **Крупскі раён.**

Бянько А. Г. — **Парыцкі раён.**

Будай К. І., Капуба Н. І., Казнадзей В. Н., Стыпуцька М. М. — **Дзяржынскі раён.**

Балло Ф. Ігнат., Крукоўскі І. І., Наумоў Т. Б. — **Магілёўскі раён.**

Буланчыкоў Я. С., Ермакоў І. Г., Іўковіч А. А., Кісялёў І. М., Макарэнка Л. А. — **Мсціслаўскі раён.**

Вітко В. К. — **Спуцкі раён.**

Варакко І. М., Мікульскі В. Л. — **Пухавіцкі раён.**

Валасач Л. Л. — **Лепельскі раён.**

Верабейчык Э. Ш., Масарскі І. Х., — **Полацкі раён.**

Грудзінскі М. М. — **Чэрвеньскі раён.**

Грыськоў П. Р. — **Любаньскі раён.**

Галіцкі Ф. М., Дзяргач Ф. К. — **Петрыкаўскі раён.**

Грашчэнка І. В., Рабчэнка К. Г., Шадура І. К. — **Клічаўскі раён.**

Дамасканаў П. Ф., Драбышэўскі І. Г., Зайцаў С. М., Казлоў Д. І. — **Чачэрскі раён.**

Дачіленка Я. І., Салагубаў В. Г. — **Клімавіцкі раён.**

Доўгі А. Е. — **Асіпавіцкі раён.**

Ісакаў Г. А. — **Расонскі раён.**

Кандраценка Т. Е., Кавалёў Г. С. — **Рагачоўскі раён.**

Коўш А. А. — **Брагінскі раён.**

Каралёў І. Д., Філіпаў А. К. — **Суражскі раён.**

Кухаронак Ф. Я. — **Ветлаўскі раён.**

Кляпец Е. С. — **Ушацкі раён.**

Кучынскі А. С. — **Чашніцкі раён.**

Лемяпонак П. М. — **Чырвонапольскі раён.**

Левін А. Х. — **Чэрыкаўскі раён.**

Мажэйка В. І. — **Кармянскі раён.**

Назаранка Н. Д., Шкляр Б. А. — **Мазырскі раён.**

Паршчыкоў І. А. — **Дрысенскі раён.**

Пірошкаў В. К. — **Хойніцкі раён.**

Радаеў М. Н. — **Лагойскі раён.**

Рудзікаў Г. П. — **Церахаўскі раён.**

Кубарскі Е. З., Сучко Д. М., Шэвярёў М. Т. — **Талачынскі раён.**

Хіменка А. А., Раеўскі Т. А. — **Тураўскі раён.**

Пяткоў П. І. — **Бешанковіцкі раён.**

Шчукаў В. В. — **Барэзінскі раён.**

Шчэрба Г. Н. — **Лоеўскі раён.**

Ярмаловіч В. Н. — **Жыткавіцкі раён.**

Антончык І. Г., Журовіч К. К. — **Капыльскі раён.**

Кубліцкая В. А. — **гор. Менск.**

Ражанскі А. Р. — **Рэчыца.**

ПК. КПК.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Сёння ў кіно «Пролетарый» аддзел культуры і прапаганды ленінізма Менгаркома КП(б)Б назначае грамадскі прагляд фільма «Чапаев» для партыйнага, прафесіянальнага і КСМ актыва.

Сакратарам парткомаў атрымаць білеты ў аддзеле культуры і прапаганды ленінізма ГК КП(б)Б, пакой № 51, у тав. Мінца.

Заг. аддзелам культуры і прапаганды ленінізма
ВАРОНЧАНКА.

Нам. вдк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

Памяшканне дзяржаўнага Беларускага Тэатра БДТ-1

СЁННЯ, 26 лістапада
адзіны канцэрт
ЮРЫЯ БРУШКОВА,
дыпламіраванага на сусветным конкурсе піяністаў імя Шопена ў Варшаве.
Пачатак у 9 гадз. веч.
Білеты прадаюцца ў рабочай касе з 12 да 2 г. дня і з 4 да 6 г. веч. і ў касе тэатра.

Кіно „СПАРТАК"
Ад 26 лістапада
НОВЫ ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
ЗА ГОНАР БРАТА
драма ў 5 частках.
У ПРАГРАМЕ КІНО-ХРОНІКА.
ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ.
Каса—з 4-х гадзін дня.

Кіно „Інтэрнацыянал"
Вялікі мастацкі фільм
БЛУКАЮЧЫЯ ЗОРКІ

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
ДРУГІ ТЫДЗЕНЬ ПАСТАНОЎКІ | ВЯЛІКІ ПОСПЕХ!
з 25 лістапада
новы гукавы мастацкі фільм вытворчасці УСХОДФІЛЬМ
ПЕСНЯ аб ШЧАСЦІ
(тайна Кавырлі)
У гал. ролях: засл. артыст В. Гардзін, Я. Жэймо, Б. Тэнін і іншых.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—НА КОЖНЫМ СЕАНСЕ
ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ:
1) Ігар Юньін—сатыра і гумар.
2) В. Воляртынскі—песні настрояў.
3) Зерноў—танцы.
ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ.
ПАЧАТАК у 5-45, 7-30, 9-15 і 11 г.
КАСА—АД 1 ГАДЗ. ДНЯ.

ДА ВЕДАМА ЗАКАЗЧЫКАЎ
„ПОСЫЛГОСТОРГ"
пры Наркомунутгаллю РСФСР, з'яўляючыся прыемнікам
„ПОСЫЛГОРТ'а"
Наркамэнабу РСФСР, даводзіць да ведама заказчыкаў, што высланыя
„ПОСЫЛГОСТОРГ'у"
задаткі да 1-га кастрычніка 1934 г., па якіх тавар да гэтага часу не атрыман, не маглі быць звернуты з-за адсутнасці дакладнага адраса заказчыкаў.
З прычыны гэтага ўсе заказчыкі, пераслаўшыя задаткі да 1 кастрычніка 1934 г. і не атрымаўшыя тавары, павінны патрабаваць высланыя імі грошы да 15 лютага 1935 года, пасведамляючы
„ПОСЫЛГОСТОРГ'у"
(Москва, Мясніцкая, 47/131) свой дакладны адрас поўнасцю імя, імя па бацьку і прозвішча, з дадаткам адпаведных дакументаў, пацвярджаючых зроблены пераход грошай.
Пасля паказанага тэрміну патрабаванні аб звароце задатку прымацца не бу ць.
„ПОСЫЛГОСТОРГ".

ШУКАЮ 1—2 пакоі у любым раёне горада. Згодзен на рамонт і іншыя выдаткі.
Звяніць па тэлефону 21—360.

ПЛАН ВЫБАРЧЫХ СХОДАЎ

менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў на 27 лістапада

№ выб. участкаў	Выбарчы ўчастак (назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый)	Лік выбарш.	Час правядзення сходу	Месца сходу	Упаўнаважаны
26	Групком работнікаў Плодагароднінны: мармеладны завод, казашчукт, Кіраўніцтва загатовак і пераапрацовак, гарная база, транспарт, Пераапрацоўчая база, засолачны пункт, база плодагароднінны	440	18 „	Сталовая базы Плодатрэста (Карла Лібкнехта, 54)	Салдаценка
27	Белкаапсаюз: апарат, гандлёвае кіраўніцтва, сельгаспадарчае кір-ва, Гасмеблесабяднанне, Хлеба-гандлёвая кантора, Плодагароднае аб'яднанне, Белкаапзалако, Белкаапсыраціна, Белкаапзаготпушка, Мясазаготгандель, БАКТ Міжрайённая база БАКТ і база БКС	560	19 „	Клуб імя VII з'езда профсаюзаў	Гуревіч (НКУ)
28	Аўтадарожны тэхнікум	254	20 „	Аўтадарожны тэхнікум	Варан
29	Наркамзем і палітсектар, ЦП саюза МТС, Ільнотрэст, служба учоту і карантына, Белсельгасснаб, Батазапчасць, Сельэлектра, НДІ соц. земляўстройства, Маслына-даследч. станцыя, Цэнтральны дом калгасніка, гарэта	790	19 „	Клуб Дома селяніна	Гінзбург
30	Скарнжная фабрыка, База саюзшвейбыта і Саюзшвейбыт	300	16 „	На фабрыцы	Мерынгоф
31	Друкарня НК, Бібкалектар, друкарня комвуза, шпалерная ф-ка, друкарня Бел. Акад. навук Паліграфтрэст, арцель паліграфтаржан	270	16 „	Клуб друкароў	Казачэнка
32	НК, ЦВК, КСК, ВСФК, Менская Міжраённая камісія па ўраджайнасці, работнікі ЦП саюза РДУ, Упоўкомзат СССР па БССР, Цэнтральная камісія па ўраджайнасці Заготлён	303	18 „	Дом тэхнікі (Комсамольская, 25)	Залескі
33	Работнікі дзіцячых садоў з № 1 па 71	585	20 „	Дом працасяўзы (Комуністычн. вул.)	Гіндзіна
34	Групком № 1 будаўнікоў ад 1кочак	930	18 „	Клуб імя Сталіна	
35	Вагоннае дэпо і служба спальных вагонаў (правадзікі).	150	15 „	Чырв. куток правадзікоў	Кузняцоў ГК КП(б)Б

ПЛАН СПРАВАЗДАЧНЫХ СХОДАЎ

менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў на 27 лістапада

№ выб. участкаў	Выбарчы ўчастак і назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.	Лік выбарш.	Час сходу	Месца сходу	Дакладчык
123	Арцелі „Чырвоны транспартнік", „Чырвоны уцільшчык", апараты саюза „Будкерамікаў", Саюзторфа і Белтранспромсаюза	259	19 гадз.	Клуб „Чырв. абутнік" (Комунальная, 9)	Бер
124	Завод стандартных дамоў, работнікі апарата Белжылсаюза	165	16 „	Чырвоны куток завода стандартных дамоў	Дзічкоўскі
125	Торфтэхнікум (навуковыя тэхнічныя работнікі і студэнты), Бўпедтэхнікум	320	20 „	Актавая зала торфтэхн. (Чырвонаарм. 16)	Лапідус Пучкін
126	Завод „Чырвоны хімік".	248	17 „	Сталовая завода	
127	Польпедтэхнікум, польскі дашкольны тэхнікум, школы №№ 19 і 6, дзіцячы дом імя ЛКСМ	230	18 „	Памяшк. б. сталовай польпедтэхнікума (Совецкая 144, п. 6)	Жарскі
128	Белпедтэхнікум, дашкольны тэхнікум і адваротны педкурсы	539	20 „	Белпедтэхнікум	
129	Беларускі дзяржаўны універсітэт (навуковыя, адм.-тэхн. работнікі і студэнты)	979	19 „	Актавая зала ВДУ	Вагдановіч (Медінстытут)
130	Служба эксплаатацыі (пасажырская) 3 і 4 змены	—	18 „	Клуб 13-годдзя	Шухлін
131	Наркамюст, гарпрокуратура, работнікі судоў, курсы пры Наркамюсце, Калегія абаронцаў, Бел. дзярж. навукова-даследны інстытут крымінальнай і судовай экспертызы	238 296	16 „ 17 „	Памяшк. Наркамюста Сталовая базы (Окцябрская, 25)	Валодзька Дарціо (Чэхі Крыж)
132	Работнікі пралень і бань	566	19 „	Клуб партактыва (вул. Карла Маркса)	
133	Хатнія работніцы групкома гаржылсаюза	300	18 „	Клуб Эльведа	Амбрэкунас
134	Утрыманцы па жактах №№ 12, 13 і ЖБКТ сувязі № 5	155	21 „	Клуб медработнікаў	Эпштэйн (гарсавет)
135	Ляхаўская паліклініка, Камароўская паліклініка, 3-я паліклініка, Лячэбная камісія, МГКУ, работнікі санаторый „Навінкі"	600	18 „	Клуб імя Левіка (пасажырская)	
136	Неарганізаванае насельніцтва (утрыманцы), пражываючае ў раёне 3-га аддзялення міліцыі	—	19 „	На месцы пабудовы	Сакалер Дзрмін
137	Пабудком № 51, буд. участак				

Гукавы кіно-тэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ"
СЁННЯ, 26 лістапада і штодзенна
ВЯЛІКІ МАСТАЦКІ ГУКАВЫ ФІЛЬМ ВЫТВОРЧАСЦІ ЛЕНФІЛЬМ
ЧАПАЕЎ
Аўтары-рэжысёры— браты ВАСІЛЬЕВЫ
Кампазітар —ПАПОЎ
Аператар —СЕГАЛ
Гукааператар—БЕККЕР
Мастак —МАХЛІС
У галоўных ролях народны артыст рэспублікі
І. Н. ПЕЎЦОЎ
Д. БАБАЧКІН
Л. КМІТ і інш.
ПАЧАТАК СЕАНСАЎ 6, 7-40, 9-20 і 11 гадз.
КАСА адкрыта з 12 гадз. дня.
Прымаюцца заяўкі на калектыўныя паходы і матавыя сеансы.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы—КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст. метраніпаж—Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр—КАГАН Б., ст. друкар—АНУЧЫН.
Уп. Галоўлітбала № К—6303.